16+

ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 36 (5297) 20 верасня 2024 г.

ISSN 0024-4686

Вынік каманднай працы
стар. 2

Сугучна са струнамі душы
стар. 6

Феномен айчыннай культуры
стар. 12

Трыадзінства традыцый

Фота БелТА.

Краіна адсвяткавала Дзень народнага адзінства. Сярод маштабных падзей, якімі запомнілася сёлетняе 17 верасня, — патрыятычны форум «Калі мы адзіныя» ў «Мінск-Арэне»; у яго рамках былі прадстаўлены яркія канцэртныя нумары і тэхналагічнае шоу ад прадстаўнікоў рэжысёрска-пастановачнай групы і артыстаў, якія прыехалі ў сталіцу з розных куткоў Беларусі. Скразная лінія мерапрыемства — адлюстраванне гістарычных і сучасных, мастацкіх і духоўных асаблівасцей рэгіёнаў краіны, а таксама галоўных каштоўнасцей беларускага народа.

На форуме выступіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы закрануў тэму не толькі гістарычных каранёў маладога дзяржаўнага свята, але звярнуў увагу і на міжнародную ваенна-палітычную абстаноўку і яе ўплыў на бяспеку нашай краіны.

Да таго ж Аляксандр Лукашэнка аб'явіў аб старце ўсебеларускай акцыі «Марафон адзінства». «Гэта будзе марафон трыадзінства традыцый: нацыянальнай культуры, якую беражліва захоўваем і развіваем, талентаў нашых людзей, якімі славіцца беларуская зямля, прыгажосці славянскай душы, якая напаўняе свет вакол гармоніяй і ўзаемаразуменнем», — сказаў Кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, гэта дасць магчымасць кожнаму адчуць усю палітру талентаў беларускай зямлі і дакрануцца да багатай спадчыны нацыянальнай культуры. «Няхай яркія фарбы і мелодыі творчасці ва ўсіх кутках краіны абудзяць у сэрцах беларусаў любоў да сваёй Радзімы», — дадаў Прэзідэнт.

«ЛіМ»-акцэнты

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў суайчыннікаў з Днём народнага адзінства. «Гэта свята гістарычнай справядлівасці, што сімвалізуе нацыянальнае адраджэнне Беларусі, — адзначыў Кіраўнік дзяржавы. — 17 верасня 1939 года ажыццявілася адвечнае імкненне беларусаў жыць на сваёй тэрыторыі адзінай сям'ёй у міры і згодзе. З тых часоў мы засвоілі ісціну: каб заставацца незалежнымі, трэба быць моцнымі эканамічна, палітычна і духоўна». У віншаванні таксама гаворыцца, што сёння, калі краіна развіваецца і ўпэўнена ідзе наперад, асабліва важна бераліва захоўваць у сэрцах любоў і павагу да роднай зямлі. «Толькі так, агульнымі намаганнямі, мы зможам перадаць нашчадкам гордае права беларусамі звацца», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

● Кіраўнік дзяржавы павіншаваў Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, з днём нараджэння. «Праваслаўная Царква адыгрывае важную ролю ў падтрыманні міжканфесійнай згоды ў нашай краіне. Сваім архіпастырскім служэннем і малітвамі вы ўносіце вялікі ўклад у захаванне і прымнажэнне маральных і культурна-гістарычных каштоўнасцей на беларускай зямлі, — гаворыцца ў віншаванні. — Ваша асабістая адкрытасць да дыялогу з людзьмі розных пакаленняў, прынцыпаў і перакананняў дапамагае кожнаму чалавеку адчуць бацькоўскі клопат і падтрымку ў цяжкую хвіліну».

Свята. Выставачны праект, прымеркаваны да 85-годдзя ўз'яднання беларускага народа, адкрыўся ў Нацыянальным гістарычным музеі. «Дзяржаўнае свята — Дзень народнага адзінства — служыць аб'ектыўным напамінам аб самадастатковасці беларускай нацыі і непахіснасці беларускай дзяржаўнасці, сімвалізуе пераемнасць усіх пакаленняў беларускага народа, фарміруе пачуццё датычнасці кожнага грамадзяніна да лёсу краіны і ўмацоўвае згуртаванасць грамадства на шляху пабудовы моцнай, суверэннай і квітнеючай Беларусі», — адзначаюць арганізатары. Новы праект падрыхтаваны НГМ у рамках Гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сумесна з Уладзімірам Ліхадзедавым.

Спадчына. Прэзентацыя 2-га тома Збору твораў Кузьмы Чорнага ў 12 тамах прайшла днямі ў Інстытуце літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. У кнігу ўвайшлі апавяданні 1926—1931 гадоў, якія друкуюцца ў адпаведнасці з апошняй творчай воляй аўтара, навуковыя каментарыі (гісторыка-літаратурны, тэксталагічны, рэальны), моўныя варыянты і розначытанні, якія адлюстроўваюць непасрэдную працу Кузьмы Чорнага над творамі. У тэкстах узноўлена мова пісьменніка, адлюстраваны дыялекталагічныя асаблівасці лексічных адзінак і іх граматычных форм.

Праект. Выстаўка «Ракурсы творчасці» да 85-годдя з дня нараджэння оперная спявачкі, народнай артысткі Беларусі Святланы Данілюк адкрыецца 25 верасня ў філіяле «Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры» Нацыянальнага гістарычнага музея. У экспазіцыі будуць прадстаўлены матэрыялы з фондаў музея: сцэнічныя касцюмы артысткі, афішы, фотаздымкі сцэн са спектакляў з удзелам Святланы Піліпаўны. Творчая індывідуальнасць артыскі яскрава выяўлялася ў партыях драматычнага плана: Любаша («Царская нявеста» М. Рымскага-Корсакава), Кармэн («Кармэн» Ж. Бізэ). Выступала і ў нацыянальных операх, сярод якіх — Алеся («Алеся» Я. Цікоцкага), Вераніка («Зорка Венера» Ю. Семянякі) і іншых.

Фестываль. Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры запрашае заўтра на літаратурна-музычны фестываль «Восень у Завоссі», які пройдзе ў філіяле «Музей-сядзіба Міцкевічаў "Завоссе"». Мерапрыемства ладзіцца сумесна з Баранавіцкім раённым выканаўчым камітэтам пры ўдзеле Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гасцей чакаюць экскурсіі па сядзібе, канцэртная праграма, выступленні літаратараў, інтэрактыўныя пляцоўкі, выстаўкі, квэсты, гульні, майстар-класы і фотазоны. Так, запланаваны лекцыя даследчыка-архівіста Змітра Юркевіча, сустрэча «Міцкевіч як апокрыф: нечаканае падарожжа» вядучага навуковага супрацоўніка Інстытута філасофіі НАН Беларусі Ігара Бабкова, выступленне спецыяльных музычных гасцей — народнага фальклорнага ансамбля «Сарматы» і Ілы Шынкарэнкі.

● Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы разам са Студэнцкім этнаграфічным таварыствам запрашаюць у нядзелю ў Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка», дзе адбудзецца восеньскі фэст традыцыйнай культуры «Багач». У праграме свята — урачысты абрад ссыпання зерня і запальвання агню, дажынкавыя і восеньскія спевы з розных рэгіёнаў Беларусі, майстар-класы па рамёствах, кірмаш, традыцыйныя танцы.

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

узнагароды

Талент і майстэрства

У Дзень народнага адзінства Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды. «Сёння ў Палацы Незалежнасці сабраліся сапраўдныя прадаўжальнікі традыцый тых, хто не спасаваў перад цяжкасцямі мінулага стагоддзя, хто стварaў, абараняў і паднімаў нашу краіну», — адзначыў Кіраўнік дзяржавы падчас цырымоніі.

Сярод узнагароджаных — работнікі сфер адукацыі і аховы здароўя. «Вы заўсёды побач з людзьмі, і часам ведаеце аб праблемах кожнага з нас больш, чым родныя і блізкія», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. У Беларусі таксама ганарацца вучонымі і работнікамі вытворчасці, якія ажыццявілі, у тым ліку, мару беларусаў аб народным аўтамабілі. «Сёння мы дзякуем за талент і майстэрства дзеячам культуры. Вы ўзбагачаеце нацыянальную спадчыну, ствараеце будучыню, пакідаючы ў мастацтве яркі след», — прадоўжыў беларускі лідар.

Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы ўсіх павіншаваў з высокімі ўзнагародамі і ганаровымі званнямі. У ліку тых, чые дасягненні адзначаны на высокім узроўні, — старшыня Віцебскага і Гродзенскага абласных аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамару Гусачэнка і Людмілу Кебіч. Ім прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры Беларусі». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што асабістая ўзнагарода — гэта заўсёды вынік каманднай працы, і за кожным дасягненнем краіны, гістарычным і сучасным, заўсёды стаяў і будзе стаяць увесь народ.

Звяртаючыся на заканчэнне да ўзнагароджаных, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Вы — людзі асаблівыя. І ў гэты асаблівы дзень для краіны я яшчэ раз віншую вас з высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі. Тут найлепшыя з найлепшых. Я буду рады сустрэцца з вамі, дасць бог, яшчэ раз, а, можа, і неаднойчы ў гэтай зале, каб уручыць вам чарговыя дзяржаўныя ўзнагароды. Упэўнены, вы гэтага дасягняце. Вы гэта заслугоўваеце!»

Яўгенія ШЫЦЬКА

з нагоды

Натхніцца лёсам

У Брэсцкай гарадской бібліятэцы імя А. С. Пушкіна адбыўся традыцыйны літаратурна-паэтычны марафон «За Радзімы жыццё», прысвечаны Дню народнага адзінства. У ім прынялі ўдзел паэты Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ і навучэнцы Брэсцкага абласнога ліцэя імя П. М. Машэрава.

Чарговы раз удзельнікі імпрэзы ўспомнілі паэтаў, актыўных удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі: Валянціна Таўлая, Янку Чабора, Піліпа Пестрака, Міколу Засіма... Ганаровы грамадзянін Брэста, рэвалюцыянер-падпольшчык, былы палітвязень Брэсцкай турмы, ветэран партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны Васіль Ласковіч стаяў каля вытокаў стварэння брэсцкай творчай суполкі. Ён быў членам Саюза пісьменнікаў Беларусі з 2006 года. Сёлета споўнілася 110 гадоў з дня нараджэння творцы.

Марафон распачаў Георгій Тамашэвіч, які выступіў з вершамі-прысвячэннямі Беларусі і друкаванаму слову. Юныя дэкламатары-ліцэісты прачыталі радкі песняроў заходнебеларускіх барыкад. Пра нялёгкія змагарскія дарогі паэтаў-рэвалюцыянераў, трагічныя лёсы і нязломаскі духу распавёў галоўны рэдактар радыё «Тэлерадыёкампанія Брэст», стваральнік і вядучы радыёпраграмы «Натхнёныя лёсам адзіным» Васіль Барысюк. Сваімі ўспамінамі, творчымі набыткамі, паэтычнымі прызнаннямі падзяліліся Зінаіда Дудзюк, Ірына Морых, Наталля Кандрашук, Ірына Фаміна.

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ

прэміі

Краіна адзіная

Шэраг творчых мерапрыемстваў, прысвечаных Дню народнага адзінства, правялі пісьменнікі Мінскага гарадскога аддзялення СПБ. Так, у Цэнтральным Доме афіцэраў перад курсантамі ваенных факультэтаў сталічных ВНУ выступілі старшыня МГА СПБ Міхась Пазнякоў, публіцысты Уладзімір Макараў, Віктар Ермаловіч і Віктар Паўлаў. Пісьменнікі яскрава засведчылі надзённасць, важкасць дзяржаўнага свята ў жыцці краіны.

А ў СШ № 137 імя П. М. Машэрава ў рамках праекта «Гэта мая краіна» адбылася творчая сустрэча з Міхасём Пазняковым «Беларусь — краіна адзінства». Пісьменнік нагадаў старшакласнікам аб гісторыі раз'яднання беларускага народа і вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі ў 1939 годзе, у якім, дарэчы, прымаў удзел і яго тата.

Павел КУЗЬМІЧ

Паміж радкоў

Імёны пераможцаў Брэсцкай абласной літаратурнай прэміі імя У. Калесніка названы ў Івацэвічах, сталіцы Дня беларускага пісьменства. Урачыстасць прайшла 11-ы раз.

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч уручыў аўтарам заслужаныя ўзнагароды на пляцоўцы Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага «Зямля любові нашай — Берасцейшчына». Літаратурнай прэміяй Брэсцкага аблвыканкама ў намінацыі «Проза» ўзнагароджана пінчанка Марыя Ляшук (за зборнік апавяданняў «Сквозь зимы и вёсны»), у намінацыі «Паэзія» — ураджэнка вёскі Сакалова Бярозаўскага раёна Алёна Папко (за зборнік паэзіі «Мой сад»), у намінацыі «Дзіцячая літаратура» — Таццяна Дземідовіч (за зборнік апавяданняў «МармеЛадное лето»).

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ

конкурсы

Філасофскае асэнсаванне жыцця

Падчас святкавання XXXI Дня беларускага пісьменства старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч на пляцоўцы Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага «ўручыў узнагароды пераможцам рэспубліканскага літаратурнага конкурсу за найлепшы паэтычны зборнік «Жывём, як светлай памяці зарок».

На конкурс паступіла 47 заявак. Усе кнігі пераможцаў і фіналістаў конкурсу ўжо папоўнілі фонды Брэсцкай абласной бібілятэкі.

Спецыяльным дыпломам за філасофскае асэнсаванне жыцця і яркія вобразы ў паэзіі ўзнагароджана Ірына Морых (г. Брэст) за зборнік «Незаменимые слова и лица». Спецыяльны дыплом за яркія вобразы прыроды ў паэзіі і самабытнасць атрымала Таццяна Шульга (г. Брэст) за кнігу «От весны и до весны». Спецыяльнымі дыпломамі «Адкрыццё» адзначаны Вольга Сяліцкая (г. Мінск) за зборнік «Есть» і Алена Котава (г. Кобрын) за зборнік «Бабуліны рукі».

Дыпломам трэцяй ступені ўзнагароджаны Святлана Цмугунова з гарадскога пасёлка Дрыбін Магілёўскай вобласці — за выданне «Жыві, Радзімы родны кут» і Кацярына Каламійцава-Ігнацюк з Гродна — за зборнік «Женщина в красном».

Дыпломам другой ступені ўзнагароджана Вольга Алізар з Гродна — за зборнік «О тебе, моя милая Родина».

Дыплома першай ступені ўдастоены Таццяна Яцук з Баранавіч — за зборнік «Мудрасць вечара» і Людміла Кебіч з Гродна — за кнігу «Мае начныя бліскавіцы».

Уладальніцай Гран-пры літаратурнага конкурсу імя Яўгеніі Янішчыц «Жывём, як светлай памяці зарок» стала аўтар зборніка «Пуцявіна» Зінаіда Дудзюк (Брэст).

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ

дарэчы

«Леаніды…» Караткевіча па-руску

У маскоўскім выдавецтве «Престиж Бук», якое спецыялізуецца на выданні якасна аформленых ілюстраваных кніг, працягваецца выхад у свет Збору твораў Уладзіміра Караткевіча. Спачатку планавалася, што выданне будзе складацца з шасці кніг, але потым, пасля дадатковага ўзгаднення і зацвярджэння плана, было вырашана выдаць і сёмы том.

У мінулыя гады падрыхтаваны і выдадзены тры тамы. У першы ўключаны аповесці і легенды пісьменніка («Дзікае паляванне караля Стаха», «Цыганскі кароль», «Сівая легенда», «Ладдзя Роспачы», «Маці Ветру», «Легенда аб бедным д'ябле і аб адвакатах Сатаны»), у другі — раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні: Евангелле ад Іуды», у трэці — раман «Чорны замак Альшанскі», аповесць «Лісце каштанаў» і паэма «Чазенія». І вось нарэшце выйшла чацвёртая кніга, дзякуючы якой расійскі чытач азнаёміцца з раманам «Леаніды не вернуцца да Зямлі», аповесцю «Зброя», апавяданнямі «Маленькая балерына» і «Белае Полымя».

Аматарам творчасці Уладзіміра Караткевіча, напэўна, вядомая гісторыя з вышэйназваным раманам. Для іншых нагадаем. Па-першае, пры жыцці пісьменніка твор так і не публікаваўся з аўтарскім загалоўкам: і ў «палымянскай» публікацыі 1962 года, і ў кніжным выданні 1982 года абрана назва «Нельга забыць» (аўтарская воля захавана ў новым Зборы твораў, т. 6). Па-другое, падрыхтаваны да друку ў 1963 годзе набор кнігі з раманам быў рассыпаны з-за адмовы аўтара ўносіць істотныя змены, якія нівеліравалі аўтарскую задуму і не адпавядалі яго светабачанню. Па-трэцяе, гэта першы *апублікаваны* пераклад рамана (у архіве захоўваецца пераклад Васіля Сёмухі 1960-х гг.).

Творы тома тэматычна звязаны з Расійскай Федэрацыяй, і гэта таксама дадатковая падстава для яе жыхароў азнаёміцца з кнігай: асноўныя падзеі рамана, аповесці і апавядання «Маленькая балерына» адбываюцца ў Маскве, у апавяданні «Белае Полымя» — на Камчатцы.

Пераклад твораў праекта, які задуманы і выконваецца выдавецтвам «Престиж Бук», ажыццявіў Пятро Жаўняровіч. У наступным томе чытач знойдзе раман «Каласы пад сярпом тваім» (у дзвюх кнігах), потым выйдзе том з апавяданнямі, казкамі і эсэ пісьменніка. У апошнім томе — знаёмства з Уладзімірам Караткевічам — паэтам і драматургам, а таксама з поглядам пісьменніка на Беларусь у «Зямлі пад белымі крыламі».

Васіль АЗЯРЭЦ

«ЛіМ»-люстэрка

У Музеі часу і гадзіннікаў у Маскве адкрылася выстаўка, якая расказвае пра гісторыю гадзіннікага майстэрства. Яна прымеркавана да 70-годдзя Мінскага гадзіннікавага завода, удакладняе БелТА. Экспазіцыя пачынаецца з арыгінальных дакументаў і чарцяжоў часоў будаўніцтва Мінскага гадзіннікавага завода, а таксама механізмаў і дэталей гадзіннікаў. Сярод экспанатаў — першыя вырабленыя на мінскім заводзе экзэмпляры — гадзіннікі пад маркай «Заря» і «Минск», хранометры з сімволікай Алімпіяды-80 і г. д. Асобны раздзел — «"Луч" у космасе»: гледачы могуць убачыць гадзіннік, які быў на руцэ першай беларускай жанчыны-касманаўта Марыны Васілеўскай падчас яе знаходжання на МКС, а таксама ўнікальныя фатаграфіі, падараныя маці Юрыя Гагарына работнікам завода. Працягваюць экспазіцыю сучасныя калекцыі завода. Гэта ў тым ліку лімітаваныя серыі «Мова», «Краски мира», «Расписные узоры», «Луч 70».

Дзень беларускай культуры прайшоў у Маскоўскім доме нацыянальнасцей, перадае БелТА. У рамках мерапрыемства адбыўся міжнародны круглы стол «Асветнікі зямлі беларускай». Госці свята змаглі прыняць удзел у майстар-класах, а таксама азнаёміцца з выстаўкамі «Суверэнная Беларусь», падрыхтаванай БелТА, «Беларусь і беларусы», на якой былі прадстаўлены экспанаты з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея, і «Дакрануцца душой да спадчыны» — праект, арганізаваны Міністэрствам культуры Беларусі, быў прысвечаны нематэрыяльнай культурнай спадчыне. Завяршылася свята канцэртам з удзелам прафесійных і самадзейных калектываў. Арганізатарам мерапрыемства выступіла рэгіянальная нацыянальна-культурная аўтаномія «Беларусы Масквы» пры падтрымцы Цэнтра славянскіх культур бібліятэкі замежнай літаратуры імя Рудаміно і Маскоўскага Дома нацыянальнасцей.

Завяршыўся XXVIII Міжнародны тэатральны фестываль «Белая Вежа». Што да вынікаў, у намінацыі «За захаванне традыцый рускага тэатра» ўзнагароджаны Дзяржаўны маладзёжны тэатр Узбекістана, які прадставіў спектакль «На бойкім месцы». За ўвасабленне нацыянальнай тэмы адзначаны спектакль «Карней» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Дыплом за найлепшае пластычнае рашэнне ўручаны Дзяржаўнаму ордэна Дружбы народаў рускаму драматычнаму тэатру імя У. Маякоўскага з Таджыкістана, які паказаў у Брэсце спектакль «Баляванне падчас чумы». Найлепшы акцёрскі ансамбль — калектыў Усходне-Казахстанскага абласнога драматычнага тэатра (Усць-Каменагорск) за ігру ў спектаклі «Дуброўскі. Пачатак...». Найлепшым спектаклем тэатра лялек назвалі «Рагнарок. Гібель багоў» у пастаноўцы кемераўскага Тэатра лялек Кузбаса імя А. Гайдара. Першым спектаклем драмы на фестывалі прызнаны «Ляўша» — яго прадставіў Нацыянальны музычны драматычны тэатр Рэспублікі Комі з расійскага Сыктыўкара.

Гран-пры XI Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» заваяваў узоры калектыў дзіцячай харэаграфічнай студыі пры дзяржаўным акадэмічным ансамблі танца «Урал» Чалябінскай дзяржаўнай філармоніі. Сёлета фестываль аб'яднаў больш за 65 творчых калектываў з Беларусі, Расіі, Казахстана, Кітая, Шры-Ланкі. Як нагадвае БелТА, «Сожскі карагод» упершыню сабраў у паўднёва-ўсходнім рэгіёне танцавальныя калектывы з розных краін у 1997 годзе. Форум нацэлены на пашырэнне і ўмацаванне міжнацыянальных творчых сувязей, узаемадзеянне нацыянальных культур. Заснавальнікамі падзеі выступаюць Міністэрства культуры Беларусі, Гомельскі абласны і гарадскі выканаўчыя камітэты.

Міжнародны пленэр па жывапісе «Вобраз Радзімы ў выяўленчым мастацтве» будзе праходзіць у Магілёве з 7 да 21 кастрычніка. Ён праводзіцца штогод з 1996 года на базе Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П. В. Масленікава і прысвячаецца выдатным дзеячам культуры Магілёўскай зямлі, значным падзеям і памятным датам краіны. У 2024 годзе мерапрыемства прысвечана 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 110-годдзю з дня нараджэння народнага мастака Беларусі Паўла Масленікава. Па выніках у музеі будзе прэзентаваны выставачны праект з дэманстрацыяй мастацкіх твораў удзельнікаў пленэру, інфармуе БелТА.

Выстаўку екацярынбургскага мастака Аляксея Яфрэмава «На адным дыханні» прадставілі ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага падчас Дзён Екацярынбурга ў Мінску. Праект арганізаваны пры падтрымцы Адміністрацыі горада Екацярынбурга і Міжнароднага цэнтра мастацтваў «Галоўны праспект» і прымеркаваны да Дня горада Мінска. Екацярынбург, між іншым, — горад-пабрацім Мінска. Архітэктурнай спадчыне адміністрацыйнага і культурнага цэнтра Урала і прысвечаны творы Аляксея Яфрэмава.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

У Калмыкіі — вядомы паэт, у Беларусі — легендарны партызан

Рыма Ханінава — доктар філалагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела фальклору і літаратуры Калмыцкага навуковага цэнтра Расійскай акадэміі навук, член Саюза пісьменнікаў Расіі. Літаратуразнаўца, паэтэса, перакладчыца, празаік, яна вельмі шмат робіць для развіцця беларуска-калмыцкіх літаратурных сувязей, а таксама для ўшанавання памяці пра бацьку — калмыцкага паэта Міхаіла Хонінава, які ў Вялікую Айчынную вайну партызаніў у Беларусі. На Магілёўшчыне і Міншчыне яго ведалі як партызанскага разведчыка Мішу Чорнага.

Новая кніга, што пабачыла свет у Элісце, дзякуючы намаганням Рымы Міхайлаўны, — «Ландшафт дружбы». Аўтары — Міхаіл Хонінаў і Рыма Ханінава. Выданне прысвечана 105-годдзю з дня нараджэння Міхаіла Хонінава і 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На старонках грунтоўнага выдання — вершы М. Хонінава, прысвечаныя Беларусі, як на рускай мове, так і ў перакладах на беларускую. Дарэчы, яшчэ пры жыцці калмыцкага паэта ў Мінску пабачылі свет дзве яго вершаваныя кнігі. Перакладчыкамі твораў выступілі Максім Танк, Аляксей Пысін, Юрась Свірка, Рыгор Барадулін, Антон Бялевіч, Генадзь Кляўко, Мікола Аўрамчык… Творы М. Хонінава перакладаюць на беларускую мову і цяпер. Сярод тых, хто звяртаецца да пераўвасаблення яго спадчыны, — Таццяна Сівец, Рагнед Малахоўскі, Адам Шостак, Алесь Карлюкевіч. Магчыма, з часам у Мінску з'явіцца яшчэ адна кніга партызанскага паэта — «Званы Хатыні», паэма, якая не ўвайшла ў ранейшыя беларускія кнігі М. Хонінава. Яе перакладчыкі — Рагнед Малахоўскі, Адам Шостак. Твор ужо друкуваўся ў часопісе «Полымя», а таксама ў калектыўным зборніку, прысвечаным Хатыні.

У кнізе «Ландшафт дружбы», якая, несумненна, павінна зацікавіць беларускага чытача, — мноства дакументальных, біяграфічных, гісторыка-літаратурных матэрыялаў, а таксама пераклады беларускай паэзіі на калмыцкую мову, здзейсненыя Рымай Ханінавай.

Сяргей ШЫЧКО

за падзеяй

Шанаваць сваю мову

Да Дня народнага адзінства ўжо трэці раз праходзіла рэспубліканская дыктоўка, удзел у якой прынялі студэнты ўсіх навучальных устаноў краіны.

Фота з сайта oo-spd.by

Сёлета месцам трансляцыі быў абраны Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, а ў якасці дыктара — першы намеснік старшыні СПБ Алена Стэльмах. Тэкст дыктоўкі так і называўся — «Дзень народнага адзінства».

— Мяне ўразіла, як уважліва слухала моладзь пра важныя ў нашай гісторыі падзеі, — расказала Алена Стэльмах. — Я адчула сугучча ліцця маладых сэрцаў — гэта патрыёты. Адназначна!

Дыктоўка нагадала пра значныя вехі фарміравання нашага адзінства — вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў 1939 годзе, аб'яднанне Заходняй Беларусі і БССР, што з'явілася актам гістарычнай справядлівасці і падарыла магчымасць беларускаму народу жыць і развівацца ў адзінай дзяржаве. Мы выстаялі і ў гады Вялікай Айчыннай вайны, бо былі разам, у братэрскім саюзе. Ганарымся нашай краінай як заснавальніцай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Адзінства Беларусі ўвасабляе інстытут прэзідэнцтва, які сфарміраваўся ў 1994 годзе і выступае як асноўны механізм забеспячэння абароны суверэнітэту і бяспекі ў сучасным свеце.

«Наша адзінства — сапраўдная нацыянальная каштоўнасць, якую неабходна паважаць, берагчы і абараняць!» — такім знакавым быў апошні сказ дыктоўкі. Алена Стэльмах дадала:

— Я думаю, што кожны можа працягнуць гэты тэкст. Дабавіць уласнае разуменне і адчуванне каштоўнасці адзінства, значнасці свайго ўнёску ў дабрабыт і росквіт краіны!

Выдатна, што моладзь ахвотна далучаецца да лінгвістычнага іспыту, вынікі якога пасля кожны правярае сам. І, безумоўна, ён перамагае. Бо любіць сваю мову, родную краіну, шануе наша адзінства — як сапраўдны беларус.

Марыя ЛІПЕНЬ

імпрэзы

Да дня горада

Мерапрыемства, прысвечанае Дню горада, адбылося ў сталічнай бібліятэцы № 8 імя Максіма Багдановіча. На сустрэчу з вучнямі шостага і сёмага класаў СШ № 86 быў запрошаны вядомы пісьменнік Міхась Пазнякоў.

Навучэнцы самі пажадалі сустрэцца з літаратарам. Па-першае, яны часта знаёміліся з творамі пісьменніка па школьнай праграме. А, па-другое, зацікавіліся яго навукова-пазнавальнай кнігай «Прогулки по Минску. Город, который выбирают дети». Таму сустрэча атрымалася асабліва цёплай і шчырай. Пісьменнік уключаў дзяцей у размову пра сталіцу, яе мужнае і стваральнае мінулае і сучаснае, выдатныя мясціны, знакамітых жыхароў, адметныя дасягненні ў самых розных галінах.

Павел КУЗЬМІЧ

Сяргей ТРАХІМЁНАК:

«Кніга — гэта феномен рэчаіснасці»

Штучны інтэлект можа многае. Замяняе працаўнікоў на вытворчасці, у сферы абслугоўвання, ужо замахваецца на настаўнікаў і пісьменнікаў, казыраючы сваім дасканалым, усёмагутным розумам. А што заменіць цяпло настаўніцкай рукі, пісьменніцкую чуласць? «Мы навучыліся жыць галавой, але развучыліся жыць сэрцам», — гаворыць адзін з галоўных герояў новай кнігі «Жыццё клетак» (Выдавецкі дом «Звязда») Сяргея Трахімёнка — пісьменніка, які вывучае цяперашнюю рэальнасць, дзе прагрэс і тэхнічныя дасягненні набліжаюць да ілюзорнага ідэальнага існавання, але немінуча аддаляюць ад чагосьці галоўнага… Ад чаго і якая тут роля пісьменніка — пра гэта гутарым з Сяргеем Трахімёнкам.

Фота Кастуся Дробава.

— Галоўны герой вашай кнігі «Жыццё клетак» Крамар — пісьменнік, які даследуе вечныя ісціны і канстатуе, што чалавек стаў выкарыстоўваць розум па-за задумай Бога. Высновы Крамара заснаваны на вашых асабістых пошуках?

— Я з'яўляюся часткай соцыуму і, зразумела, хварэю на ўсе яго хваробы, як і большасць або меншасць соцыуму, спрабую знайсці адказы на пытанні, што хвалююць грамадства. І, канечне, погляды Крамара, зрэшты, як і астатніх персанажаў, часткова з'яўляюцца маімі.

— Крамар гаворыць словамі Хрыста і трансліруе евангельскія пастулаты, напрыклад: «Аддайце Богу богава, а кесару — кесарава». Як лічыце, што богава? Можа, адказ — у евангельскай прытчы аб талантах? І чалавек, яго жыццё — своеасаблівая інвестыцыя Бога, якая прадугледжвае дывідэнды? Таму расчараваны Крамар? Маўляў, дывідэндаў малавата, адны страты?..

— Наўрад ці гэта так. Бо многія, хто жывуць сёння, выкарыстоўваюць афарызмы мінулага, якія не вісяць у паветры, а ўкладзены ў вусны знакавых фігур мінулага, «как в клиру, так и в миру». Крамар — дастаткова прасунуты чалавек, каб крыўдзіцца альбо быць расчараваным Стваральнікам, тым больш, як гандлярка на рынку, падлічваць дывідэнды або страты.

— Якія падзеі ў жыцці прымусілі вас звярнуцца да Кнігі кніг, да евангельскіх запаведзей?

— Я не звяртаўся да Кнігі кніг спецыяльна. Але як чалавек, які фарміраваўся ў рамках хрысціянскай культуры, не мог існаваць па-за яе нормамі, зрэшты, як і мае персанажы.

— «Стваральнік надзяліў чалавека розумам, але чалавек стаў выкарыстоўваць розум па-за задумай Бога», — выснова Крамара справядлівая, але, значыць, зыходзячы з гэтага, Стваральнік недасканалы? Няўжо ён не мог гэтага прадугледзець?

— Чалавек толькі мяркуе, што Стваральнік надзяліў яго розумам для вырашэння яго, Стваральніка, задач. Праўда, той жа чалавек разумее, што ў апошнія стагоддзі перастаў выконваць гэтае прызначэнне, гэта значыць, перастаў «чуць голас касмічных стыхій, а засяродзіўся на свеце дробных чалавечых страсцей».

— А ці чуюць голас на планеце ТуіСто, якая ўводзіцца пазней у сюжэт і дзе няма адліку часу? Гэта мадэль нашай будучыні з такімі асобінамі, як АЛ102, якія рызыкуюць быць выбракаванымі, калі перастануць «чуць голас»?

— Не, планета ТуіСто — гэта цела персанажа, які праводзіў вопыт на сабе з дапамогай нанапілюлі, што носіць сімвал АЛ102. Гэта не мадэль нашай будучыні, гэта экстрапаляцыя паміж біялагічным арганізмам чалавека і чалавечым грамадствам. У першым элементы — клеткі, у другім — людзі.

— Ці змогуць рабатызаваныя асобіны, як туісцянец АЛ102, рабіць усё аўтаматычна, але, тым не менш, якасна? Уводзячы ў сюжэт блокі пра планету ТуіСто, вы хацелі паказаць фінал чалавецтва, калі пачне ўладарыць штучны інтэлект?

— Таксама не. Асобіны планеты ТуіСто не настолькі рабатызаваны. І ў кнізе ёсць дакладнае разуменне, што штучны інтэлект, створаны з мёртвай неарганічнай матэрыі, не настолькі страшны для чалавецтва. Іншая справа — калі ШІ можа ўзнікнуць на аснове жывых арганізмаў, тады з'явіцца небяспека: такі ШІ будзе лепш выконваць задачы Стваральніка, і такое звяно, як чалавек, перастане быць яму патрэбным.

— «Арганізм моцны кожнай клеткай, калі яна разумее, што павінна працаваць на ўвесь арганізм… Калі клетка траціць на сябе не больш чым 20 % свайго рэсурсу, яна здаровая, калі больш — ракавая…» — робіць выснову Крамар. Працяддзе ад раку? Зноў вяртаемся у Евангелле, якое дае рэцэпт для здароўя душы — жыць дзеля іншых? А вы прытрымліваецеся гэтых 20 %?

— Калі мой персанаж гэта сцвярджае, значыць, я прытрымліваюся гэтага пункту гледжання альбо выкарыстоўваю яго як супрацьлеглы.

— Вы казалі, што пісьменнік сваімі творамі займаецца сацыяльным рэгуляваннем. А што яму рабіць у эпоху распаўсюджвання штучнага інтэлекту, які адсоўвае пісьменніка, сам ствараючы творы па шаблонах, зададзеных схемах?

— Справа ў тым, што сацыяльнае рэгуляванне магчыма і эфектыўна тады, калі яно нарматыўна. Пісьменнік жа індывідуальны, і наўрад ці ён, а дакладней яго творы і арыенціры могуць быць асновай рэгулявання сацыяльных працэсаў.

— А такіх, як сёння? «Тое, за што нядаўна лаялі "Запад, які загнівае", — ужо ў кожным горадзе, доме, сям'і», — гаворыць другі галоўны герой кнігі Крапак. Як пісьменніку рэагаваць на падмену паняццяў, якую навязваюць тыя сусветныя гульцы, хто робіць сёння суседзяў і братоў ворагамі, хто дэманструе эканамічны дыктат і стварае палітычныя праблемы? Ці значыць гэта, што для пісьменніка настаў час паказаць выскал, выйсці на інфармацыйны фронт?

— Пісьменніку не трэба скаліцца. Не існуе нейкага адзінага чалавецтва і адзіных каштоўнасцей і арыенціраў. Для кожнага пісьменніка ёсць два шляхі ўздзеяння на чытача. Першы — адлюстраваць нейкі ідэал, да якога трэба імкнуцца. Другі — адлюстроўваць рэальнасць, якой бы непрыемнай яна ні была. У другім выпадку ўзнікае эфект тугі па ідэале, і ён, бадай, самы надзейны.

— «Канцэнтруючыся на ідэі, персанажах, тэксце, знарок ці незнарок упадзеш у нейкі пісьменніцкі транс, і ўсё, што хочаш напісаць, пачынае пісацца само», — гаворыць Крамар. Так і ў вашым працэсе творчасці?

— Усё гэта вельмі індывідуальна. Я навучыўся ўваходзіць ва Усяленскую бібліятэку, дзе ўсё напісана, гадоў праз дзесяць работы з чыстым аркушам паперы.

— А як уваходзіць ва Усяленскую бібліятэку?

— Па-рознаму: можна паставіць ногі ў таз з халоднай вадой… І тады кроў падыдзе да галавы. Можна як Высоцкі… Але гэта як свечка, якую запаліць з абодвух бакоў: цябе не застанецца…

— А яшчэ як?

— Я спортам калісьці пачаў займацца, а менавіта лыжамі, прытым што да іх па канстытуцыі, фізіялогіі не схільны, а пачаў займацца таму, што ў мяне былі ангіны. А калі па дзясятцы кіламетраў у дзень прабягаеш, ангіна праходзіць (смяецца). А самае цікавае — як толькі кідаеш бегаць — вяртаецца зноў… Паколькі да лыж я не схільны, трэба было сябе прымушаць. Вырашыў: калі цяжка, трэба пацярпець, і тады шчоўк — з'яўляецца другое дыханне.

— І колькі цярпець?

— Калі табе цяжка і ты кінуў — не дасягнеш, а калі будзеш цярпець — шансаў больш.

— Гэтак жа вы выпрабоўвалі цярпенне, калі больш як 10 гадоў прапаноўвалі свае апавяданні, аповесці розным часопісам у Маскве, Свярдлоўску, Новасібірску і паўсюль атрымлівалі адмовы?

— Я не тое, што цярпеў — мяне гэта раздражняла. Да той пары, пакуль аднойчы не сустрэў старэйшага калегу па пяры Мікалая Самохіна, вядомага савецкага белетрыста і сатырыка. Ён быў вельмі папулярны ў Новасібірску, працаваў сабкарам «Литературной газеты». Пазнаёміліся з ім у 1983 годзе ў горадзе Куйбышаве і, як ні дзіўна, пасябравалі. Мне ён быў цікавы як пісьменнік, а я яму — як чалавек рэдкай прафесіі, з якой ён ніколі не сустракаўся: я тады служыў у КДБ. Гадоў шэсць — сем мы з ім сябравалі. У маладосці ён займаўся боксам. А я прыехаў у 1988 годзе на спаборніцтвы па рукапашным баі. Ён загарэўся: «Вазьмі мяне з сабой, я пагляджу, што гэта такое». Якраз выйшла яго новая кніга. Ён падпісаў мне яе ў вершы: «Смех — не антибиотик, // Но способствует порой: // То опустошит животик, // То подлечит геморрой». Жонка яго абуралася, маўляў сорамна паказваць. А аказалася ўнікальная рэч, я ж не ведаў, што праз два месяцы яго не стане. Мы пайшлі на спаборніцтвы, ён прыхапіў з сабой кнігу. Мне выпаў складаны бой. Сапернік касцісты з доўгімі рукамі, раз мне — у сонечнае спляценне — ледзь вочы не вылезлі! Два — вырашыў, пэўна, дабіць. Але потым крыху не разлічыў. Я — во дзе цярпенне! — злавіў яго на кідок і сумленна выйграў. А паколькі аб'явілі перамогу, Мікалай думаў, што гэта фінал, пабег і ў журы аддаў сваю кнігу як прыз сімпатый гледачоў. Так у мяне аказаліся дзве аднолькавыя кнігі: адна — з вершам, а другая — са словамі «Сяргею Трахімёнку за раптоўную бліскучую перамогу ў рукапашным баі. Снежань 1988 года». Дык вось гэты чалавек мне сказаў: «Калі ты хочаш пісаць, то пішы і ні на кога не звяртай увагі, не прымай блізка да сэрца, інакш з'ядуць цябе твае ж думкі».

— Як жа адбылося, што вас пачалі друкаваць?

— Глядзі: ты стаіш перад сцяной і б'еш, б'еш лобам… Калі лоб моцны — упадзе сцяна, калі моцная сцяна — лоб!.. (смяецца.)

— А не хацелася ўсё кінуць?

— Бясспрэчна, але сябар Коля перакanaў: ты не лепшы і не горшы за іншых, таму не трэба адчайвацца, калі цябе падаўляюць. Ёсць шмат прычын адмоў. Быў тады часопіс «Уральский следопыт», і я туды адпраўляў свае творы, але друкавалі не мяне, а заўсёдных аўтараў-куміраў…

— А можа, усім, хто знаходзіцца на этапе ўзрастання, трэба прайсці праз гэта?

— Не выключана.

— Ваш герой Крамар гаворыць, што, калі працуе над кнігай, жыве ёю і ў ёй. Але калі кніга напісана, яна пачынае жыць сваім жыццём. А як у вас? Напісаная кніга — як дзіця, якое стала паўналетнім?

— Не, яна не дзіця, яна феномен рэчаіснасці, які існаваў у нейкім тонкім свеце, але з дапамогай пісьменніка перайшоў у свет матэрый грубых.

— Упершыню асобнай кнігай ваш раман «Гульні капрызнай дамы» выйшаў, толькі калі вам споўнілася 45 гадоў (да гэтага друкаваўся ў літаратурных часопісах). Як лічыце, доля геніяў — быць пакінутымі без увагі?

— Безумоўна. Я не прайшоў шлях вучэбных устаноў, пісьменніцкіх семінараў. Такіх, як я, у Расіі называюць дзікаросамі. Што датычыць геніяў, то гэта тэма асобнай гутаркі. Магу цалкам дакладна сказаць, што да іх ліку не адношуся.

— Якія ў вас адносіны з паэзіяй? Вы адзначалі, што пасля сустрэчы з рускім бардам і паэтам Мікалаем Шыпілавым пачалі збіраць калекцыю болевых вершаў. А самі іх пішаце?

— Я не пішу вершаў, бо рабіць гэта павінен той, хто не згубіў адчуванне палёту і палётнасці. А я пачаў пісаць прозу, калі ўжо хадзіў па зямлі. Адсюль у мяне патрэба ў нейкай кампенсацыі, гэта значыць калекцыяніраванні вершаў іншых паэтаў. У Валодзі Балачана, майго сябра, аўтара слоў да песні «Хлеб — усяму галава», калі ён вучыўся ў Літінстытуце, майстрам быў паэт Аляксандр Межыраў. Ён казаў: «До тридцати поэтом быть почётно, и стыд кромешный — после тридцати». Чаму? Бо знікае палётнасць. Я магу парыфмаваць, пахуліганіць, але гэта не вершы.

— А што тады вершы?

— Па-рознаму вызначаюць. Паэт Яўгеній Еўтушэнка ў вершы «Поэт в России больше, чем поэт» просіць: «О, дай мне, Блок, туманность вещую // и два кренящихся крыла, // чтобы, тая загадку вечную, // сквозь тело музыка текла». Можа, паэзія — гэта не рыфма, а канал, які ўзнікае паміж Усяленскай бібліятэкай і паэтам?

— Ваша апавяданне «Іголка ў квадраце» дало назву зборніку найноўшай серыі «Сучасная беларуская літаратура» выдавецтва «Аверсэв». Галоўная гераіня — медсястра, якая непераўзыдзена рабіла ўколы… Падзеі дэтэктыўнага характару з'яўляюцца для вас найлепшай прасторай для ўвасаблення пісьменніцкіх задумак?

— Не, дэтэктыў тут ні пры чым. Проста востры сюжэт часта выцякае або перарастае з крымінальнага расследавання або нейкай таямніцы.

— Як паўплываў на ваш лёс Мікалай Чаргінец?

— У 1990 годзе, калі я толькі прыехаў і Мінск, быў на сустрэчы з пісьменнікам Мікалаем Чаргінцом. Тады я яго не ведаў. На той сустрэчы было шмат выступоўцаў. Але мяне ўразіў адзін «афганец», які прыйшоў з букетам кветак і выказаў падзяку Мікалаю Іванавічу за тое, што ён знайшоў яго ў адным са шпіталяў пасля страты памяці ад цяжкага ранення і адправіў у Саюз на радзіму. А яшчэ ў Афганістане яго называлі Бацькам родным. Гэта пра многае гаворыць, калі не пра ўсё. І гэта ў далейшым вызначыла маё стаўленне да яго.

— Што б вы параілі маладым літаратарам, пачаткоўцам?

— У мяне занадта доўгі шлях у літаратуру, каб выдаць яго ў якасці прыкладу альбо парады…

Гутарыла Наталля СВЯТЛОВА

«Рэдактарскі аспект» у тэорыі і на практыцы

Перш за ўсё хочацца выказаць шчырую падзяку шаноўнаму калегу, дацэнту Пятру Пятровічу Жаўняровічу, за водгук на мае, змешчаныя «аж у трох нумарах “газеты творчай інтэлігенцыі Беларусі” артыкулы (…), якія закранаюць функцыянаванне лексемы *Ражджаство*». Асаблівай удзячнасці заслугоўвае тое, што ён адгукнуўся матэрыялам, у якім значэнне мае не столькі аб’ём, колькі стымулятыўнасць для чытачоў, бо перад імі зноў апынаецца разварочаная куча заляжалых, а ў той жа час нявырашаных пытанняў стану сучаснай беларускай мовы. Таму і я — на жаль, не зусім аператыўна — вырашыў, што некаторыя з іх ёсць-такі патрэба разгледзець дадаткова.

Заканамерным і ва ўсіх адносінах дарэчным большасцю чытачоў, думаецца, успрынялося тое, што наш апанент вырашыў выходна скарыстаць у якасці апірышча досвед ад уласнай практыкі як дарадцы, кансультанта-моўнаазнаўца. Заклапочанасць калегі тым, каб суайчыннікі, збітыя з панталыку адвольным ужываннем самых розных варыянтаў напісання і маўлення, перасталі блукаць у бярозах ды соснах, якія ўяўляюцца аднолькава блізкімі, а разабраліся, што сапраўды сваё, а што не, я цалкам разумею. Прычым не толькі таму, што з цікавасцю і не без карысці для сябе сачу за зместам яго калонкі ў «ЛіМе». Уплыў аказвае і вопыт аналагічны: вось ужо на працягу трыццаці гадоў самому «даводзіцца кансультаваць, даваць… парады, тлумачыць асаблівасці ўжывання таго ці іншага слова». Праўда, у мяне сфера значна меншая, паколькі абмяжоўваецца лексікай царкоўнай, праваслаўнай. Тым не менш, як да вучонага сакратара Беларускай Біблійнай Камісіі, па кансультацыі звярталіся і пісьменнікі, і журналісты, і выдавецкія рэдактары. Таму дзеля адпаведнасці прынятай на сябе функцыі давялося неаднойчы выступаць на старонках свецкага масавага і навуковага друку, удзельнічаць у складанні і папулярызацыі спецыяльнага слоўніка, першыя версіі якога друкаваліся і праз царкоўную перыёдыку тыражаваліся з сярэдзіны 1990-х гадоў, а да 2000-годдзя хрысціянства падрыхтаваць і сваю кніжку «Беларуская мова і Царква». Што ж датычыцца маёй сціплай «парафіі», то прыклады я ўжо прыводзіў, і не аднойчы, а цяпер дадаткова, каб не выпусціць з-пад увагі «рэдактарскі аспект» у практычным здзяйсненні, магу згадаць яшчэ і тое, што ў часы «перабудовы» сустракалася на старонках адной і той жа кнігі: «Абраз *Раства* Багародзіцы», «Царква *Раства* Багародзіцы», «з царквы *Раства* Багародзіцы», «царква *Раства* Багародзіцы», а разам з тым і «храм *Ражаства* Багародзіцы», «невялікая цэркаўка *Ражаства* Багародзіцы» (Гл.: Лабынцаў Ю.А. Старая казка Палесся (Турава-Пінская зямля). — Мінск, 1993. Сс. 78, 83, 84, 93 і 69, 88—89). Падобнае не бянтэжыла і пазней... І ў нядаўнім нумары таго штотыднёвіка, што дае нам магчымасць для агучвання «правільных установак», аналагічна: «Сумесная выстаўка Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (…) і манастыра *Нараджэння* святога Іаана Хрысціцеля (…) Так, прадстаўлены прынт-копіі жывапісных работ манашкі Марыі, насельніцы манастыра *Раства* святога Іаана Хрысціцеля …» «(Літаратура і мастацтва, 5.07.2023. С. 3).

Выходзіць, ні Пётр Пятровіч пры яго аўтарытэтнасці, ні я пры сваёй дробназначнасці пакуль што не здольны дамагчыся словаўжывання правільнага ці хоць бы ўніфікаванага. А пры ўсім гэтым як мы абодва, так і многія нашы чытачы, павінны б разабрацца, ў чым справа. Адказаць жа на гэтае пытанне ў прынцыпе немагчыма, калі выходна абмяжоўвацца тлумачэннем спецыфікі асобных слоў, роўна як і філалагічны падрыхтоўкай канкрэтных аўтараў, а тым больш рэдактараў, незалежна ад таго, якому «аспекту» ў тэорыі яны аддаюць перавагу. Ідэальны (ці ідэалістычны) варыянт — каб усё грамадства ды з усёй адказнасцю паставілася да закранутай намі праблемы як татальна пагрозлівай. І вось тут «рэдактарскі аспект» меў бы магчымасць раскрыцца напоўніцу, калі б дапамог збянтэжанаму грамадству ўсвядоміць, што карэнне моўнага пустазелля ў нас доўгі час ужо без перашкод сілкуецца недапушчальна слаба, калі не сказаць, што зусім фіктыўна, замацаванай нарматыўнасцю. Фікцыя тут выяўляецца ў тым, што клопат пра нормы і правільнасць апынуўся ў межах дзейнасці, прабачце, занудных дзівакоў, накшталт І. Чароты і П. Жаўняровіча. А тым часам няўхільна ідзе ўсёахопнае разбурэнне кадыфікацыі той мовы, адданасць якой па завядзёнцы публічна дэкларуецца яшчэ многімі.

Фота БелТА.

Канкрэтызуючы сказанае, проста немагчыма не засяродзіць увагу яшчэ раз на тым, што ў нашым (у)моўным правапісе замест прынцыпа фанетычнага дзейнічае анархічны, рэальны сэнс якога ў тым, што пісаць можна «як хочацца», а не «як чуецца». І гэтае «як хочацца» чым далей, тым больш закранае кадыфікацыю ва ўсіх іншых планах. Прычым адбываецца гэта не без уплыву канкрэтных рэдактараў з іх адвольнымі «правіламі».

Названай тэндэнцыі своеасабліва падпарадкаваным аказалася і стаўленне шаноўнага Пятра Пятровіча да корпуса праваслаўнай царкоўнай лексікі. Своеасаблівасць у дадзеным выпадку звязана з тым, што «рэдактактарскі аспект» і сам ён, здаецца, не схільны абсалютызаваць, паколькі належным чынам усведамляе прыярытэтнасць аспектаў іншых — у тым ліку і моўна-заканадаўчага, і ўласна канфесійнага ў сукупнасці з сацыяльна-псіхалагічным у адносінах да моў сакральных. Ды пажадана, каб рэдактары ўсё ж такі памяталі пра існаванне «боскай рэальнасці» і не выкасоўвалі з рэдагаваных матэрыялаў ні яе наогул, ні канфесійных прыкмет у прыватнасці.

Аднак вернемся да той шырокаахопнай тэндэнцыі, што ўцягвае нават такога нешараговага спецыяліста, як Пётр Пятровіч. А што ўбаку ён не застаўся, даволі яскрава сведчыць такое вось яго выказванне: «Гэта азначае, што царкоўнаславянская мова ў лінгвістычным разуменні ўсё ж з’яўляецца замежнай і слоўнік ахоплівае толькі пэўную прадметную галіну — праваслаўе і тэзаўрус (кароткі) выкарыстанай у ім беларускай лексікі». Першая частка сказа тут сфармулявана без ніякіх агаворак, удакладненняў. А мы скарыстаем усё ж такі агаворку для сябе, што ў гэтым выпадку, магчыма, праяўляецца як не зусім усвядомленае падпарадкаванне адпаведнай тэндэнцыі, так і свайго кшталту карпаратыўная салідарнасць. Аднак у любым выпадку годны павагі філолаг рызыкнуў выкарыстаць шаблон, даравальны хіба што носьбіту моўнай свядомасці, якую кампанавалі на сталічных тратуарах альбо ў кавярнях, мала дбаючы пра рэальны стан беларускай мовы і ў мінулым, і цяпер. Да відавочнай абсурднасці разгортваць сцвярджэнне пра царкоўнаславянскую мову як замежную не зусім ёмка ўжо таму, што тады не абысціся без хітрыкаў у (пера)тлумачэннях, з-за якіх гэта межаў «імпартаваліся» творы свяціцеля Кірыла Тураўскага і ўсіх шматлікіх яго пераемнікаў не толькі з Турава, нашто было Скарыну пісаць: «Повелел есми Псалтырю тиснути рускыми словами, а словенским языком», а яшчэ і высвятляць, чаму «замежную» мову пераважная большасць праваслаўных беларусаў цэлае тысячагоддзе прымала і прымае ў якасці сваёй, да таго ж у статусе святой і незаменнай. Дадаткова, бадай, не лішне ўдакладніць, што мова царкоўнаславянская ў статусе роўнасвяшчэннай ад пачатку мела прызначэнне богаслужбовае, непасрэднае дачыненне да таінстваў, а таму роля сакральная і містычная сама па сабе павінна здымаць патрабаванні наконт агульнаразумеласці богаслужбовай лексікі, сэнсавай празрыстасці яе — гэтае пытанне, дарэчы, выцягнутае з куфраў пачатку XX стагоддзя, перыяду атэізацыі. Так што далёка не новая і зусім не арыгінальная «канцэпцыя» пра «чужасць» яе прынцыпова супярэчыць поглядам не адных «ачмураных цемрашалаў», але і перакананням большасці славянскіх мовазнаўцаў. Істотна таксама, што памяркоўныя лінгвісты нашых дзён і нашага асяроддзя ў адыходзе мовы сучаснай беларускай (як і шэрагу іншых) ад царкоўнаславяншчыны бачаць не больш чым вынікі дыглосіі — заканамернай, а ў пэўных межах і натуральнай.

І ўсё гэта непасрэдна датычыцца выдадзенага Праваслаўнай Царквою Беларусі слоўніка, пра які наш апанент гаворыць чыстую праўду, адзначаючы, што ён «ахоплівае толькі пэўную прадметную галіну — праваслаўе і тэзаўрус (кароткі) выкарыстанай у ім беларускай лексікі». Між тым удакладнім: ні ў самім факце выдання, ні ў яго прадстаўленні, роўна як і ў сціплым распаўсюджванні, не было і быць не магло аніякіх намераў «пераносіць усталяваную ў сваёй сферы дзейнасці лексіку на ўсю літаратурную мову». З такой фантазіяй, як і са згадкамі пра «залішнюю ўнармаванасць», «дыфуркацыю», «аўтарытэтныя крыніцы» ды непарушныя «правілы», а таксама з кампаратыўнымі экскурсамі ў дапісьмовую гісторыю беларускай мовы пры абмеркаванні сучаснай царкоўнай лексікі шаноўны калега відавочна перабаршчыў. Уласна, многія сур’ёзныя рэчы мімаходам закранаць непажадана. Асабліва гэта датычыцца паспешлівa сфармуляваных высноў, якія ўводзяць у сапраўды цяжкае недаўменне. Перш за ўсё маецца на ўвазе катэгарычная нязгода праваслаўную лексіку — дарэчнасць якой доўгі час вывяралася ўспрыманнем беларусаў-вернікаў у храме і па-за яго сценамі, — «пераносіць у газеты і часопісы, радыёперадачы, кнігі, якія ствараюцца на беларускай мове і рэдактары якіх павінны прытрымлівацца тых нормаў, што склаліся на цяперашні час». Усе контраргументы паўторна выкладаць для тых, хто іх не ўспрыняў з публікацыі альбо не прымае *a priori*, наўрад ці абавязкова. Застаецца толькі адзначыць: калі «рэдактарскі аспект» падразумявае перш за ўсё непрыманне традыцый, якія захоўваюць вопыт больш як тысячагоддзя, тады тыя «нормы, што склаліся на цяперашні час», а значыць, і ўся існуючая сістэма кадыфікацыі, проста непазбежна прыдуць да разбурэння; прычым плён працы нездарма тут на першы план высунутых рэдактараў будзе забяспечваць адпаведным працэсам імклівае паскарэнне. Вельмі б хацелася як мага далікатней адрэагаваць і на такую заўвагу: «На наш погляд, гэта лексіка абмежаванага выкарыстання, калі абслугоўвае зносіны толькі асобнай часткі беларускага грамадства». Але не хочацца, зноў жа, каб далікатнасцю замянялася аб’ектыўнасць. Таму прапаноўваем паразважаць і даць, кожны сам сабе, адказ на такія вось пытанні: Няўжо ўсе мы катэгарычна адмаўляемся лічыць светапогляд нармальным тады, калі свет успрымаецца не як тэатр альбо цырк, не як курортная зона, дзе галоўнае месца адведзена пляжу, а як прыстойны дом, дзе ёсць куток з іконамі, а то і як святы храм з алтаром? Ці маюцца ў нас прынцыповыя пярэчанні супраць таго, каб усе нашы суграмадзяне для сваіх паводзін, моўных у тым ліку, атрымалі магчымасці, адпаведныя іх светаадчуванню, а значыць, і веравызнанню? А ў сувязі з гэтым якія стымулы патрэбны, каб у калектыўнай памяці трывала замацавалася, што колькасныя «межы» праваслаўнага насельніцтва ў Беларусі пераўзыходзяць «неабмежаванасць» прыхільнікаў усіх іншых канфесій разам узятых з атэістамі ў прыдачу? Паколькі ж веравызнанне заўжды складала светапоглядную аснову, то на якіх падставах лексіцы праваслаўнага люду прыпісваецца дадатковая і выключная «абмежаванасць» у параўнанні з уласна беларускай лексікай, якая датычыцца сфер вытворча-прамысловай, прыродазнаўча-навуковай, вайсковай, медыцынскай і г. д.? А калі мы больш-менш пагодзімся ў адказах на агучаныя пытанні, то які сэнс застанецца ў выкарыстанай Пятром Пятровічам характарыстыцы: «гэта лексіка абмежаванага выкарыстання»?

Якраз у падобных выпадках звычайна гаворыцца, што пералік пытанняў можна прадаўжаць і прадаўжаць. Але мы «закруглімся», паўтарыўшы словы ўдзячнасці шаноўнаму Пятру Пятровічу за тое, што куча гэтых пытанняў, заляжалых, а ў той жа час нявырашаных, усё ж такі разварушваецца пры нашым удзеле. Дадатковай падзякі яго водгук заслугоўвае ў якасці напаміну праваслаўным філолагам, што яны ўсё ж такі не выканалі таго, што трэба, а галоўнае — так, як трэба. Таму ў ніжэйпадпісанага з’явіўся цвёрды намер прасіць у рэдакцыі «ЛіМа», каб дазволіла выкласці разбор яшчэ адной моўнай праблемы, якая пакуль што не мае адназначнага вырашэння.

Іван ЧАРОТА

Таямніца людскіх сэрцаў

Для чаго чалавек прыходзіць у гэты свет: каб вечна пакутаваць альбо вучыцца атрымліваць асалоду ад жыцця? Як імпульсіўныя рашэнні маладосці становяцца лёсавызначальнымі і цалкам змяняюць асобу і яе шлях? Ці існуе сапраўднае каханне ў сучасным прагматычным свеце? Якую цану нам трэба заплаціць за злачынствы мінулага і як гэтага пазбегнуць? На пытанні з дапамогай розных літаратурных жанраў спрабуюць адказаць аўтары сёмага нумара «Нёмана».

Часопіс традыцыйна пачынаецца з рамана. Гэтым разам на сцэне жыцця разгортваюцца драматычныя падзеі шасцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя, дзе пад вопытным кіраўніцтвам пісьменніка Фёдара Конева маладыя Ганна, Рыма і іх старэйшыя таварышы Арсеній і Васіль спрабуюць знайсці свой шлях. Рыма вельмі хацела пазнаёміць малодшую сяброўку са сваім каханым, у якога было нераспаўсюджанае і нават крыху «старэчае» імя — Арсеній. Інтэлігентнай Ганне, сапраўднай прадстаўніцы пакалення «шасцідзясятнікаў», сустрэчы ў паўразваленай вясковай хаце не вельмі падабаліся, аднак перспектыва сядзець у кватэры адной здавалася яшчэ горшай. Па даўно ўсталяваных традыцыях класічнага рамана, Ганна і Арсеній зацікавіліся адно адным. Каханне разгаралася ў сэрцах маладых людзей, а бурлівы настрой грамадзянскага ўздыму падтрымліваў хуткае збліжэнне пары. Здаецца, сюжэт вельмі прадказальны: забароненае каханне, якому наканаваны кароткі век, разбітае сэрца, парушаны лёс, а ў выніку — нечаканая сустрэча…

Аднак, нягледзячы на тыповасць апавядання, аўтар надае сваім героям непаўторныя і супярэчлівыя рысы, што прымушае чытача сачыць за развіццём гісторыі да самага канца. Стыль рамана адрозніваецца ад характару звыклых апавяданняў пра савецкі час. Тут амаль не знойдзеш прастамоўных выказванняў і лексікі, уласцівай падобным сюжэтам. Стыль вядомых рускіх класікаў Івана Тургенева, Мікалая Гогаля таленавіта пераплятаецца з сацыяльным настроем тых часоў. Тыповасці дабаўляе і агульная атмасфера безнадзейснасці. Здаецца, нарэшце прыйшла доўгачаканая адліга, у паветры пахне свабодай, аднак грамадства не можна ўздыхнуць з палёгкай — сапраўдныя запаветы Леніна так і застануцца на старонках кніг, а просты народ не стане часткай палітычнай сістэмы. Фёдар Конеў добра перадаў дух унутранага пратэсту моладзі 1960-х, спалучаючы надзею і трагедыю, упартасць і роспач у адзінае цэлае.

Урывак з паэмы «Сёстры міласэрнасці» Валянціны Паліканінай, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Мастацкая літаратура», Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, расказвае пра подзвіг жанчын на вайне. Звычайна ваенныя подзвігі і ахвяры асацыіруюцца з мужнымі салдатамі на полі бою. Аднак Валянціна Паліканіна звярнула ўвагу чытачоў да непрыкметных удзельнікаў крывавых падзей, без якіх вынік вайны мог быць зусім іншы. Гэта сёстры міласэрнасці, медсястрычкі, якія на адным узроўні з самымі вопытнымі байцамі ахвяравалі сабой і ратавалі параненых пад свіст варожых куль.

Пространство воет и скрежещет,
И враг не чувствует вину…
И мир зовет бесстрашных женщин
Идти на подвиг и войну…

Маладыя жанчыны залечвалі не толькі раны — яны замянялі хворым іх каханых, сяцёр і маці, якіх даўно забрала вайна, слухалі развітальныя словы тых, хто паміраў, адпускалі грахі і былі побач у апошнія хвіліны. Нябачныя байцы фронту, ад чыіх дзеянняў залежыць фізічны і маральны стан усёй арміі. Валянціна Паліканіна ўзяла на сябе адказнасць расказаць пра забытых герояў мінулых падзей.

Беда казалась тучей безразмерной,
Но солнцем были дочери Христа.
Без имени, а подвиг беспримерный.
Без отчества, а святости под стать.
Чума больниц. Чахоточность вокзалов.
Свирепый дым. Ушедшие в глазах…
История о многих рассказала,
О многих позабыла рассказать.



Пра лёсавызначальныя сустрэчы і глыбокую адданасць піша ў сваіх апавяданнях «Партрэт» і «Рыжык» Алесь Бадак (пераклад з беларускай Алега Ждана-Пушкіна). Віктар Канстанцінавіч малюе амаль усё жыццё, аднак вялікай славы і прызнання так і не атрымаў. Спачатку быў занадта сціплы і няўпэўнены, а пазней сярод больш вядомых калег стаў адчуваць сябе чужым. У асабістым жыцці таксама не склалася: ні жонкі, ні дзяцей у Віктара Канстанцінавіча не было. Аднак сустрэча з Вольгай Іванаўнай падарыла мастаку даўно забытае юнацкае хваляванне, якое творца адлюстраваў на партрэце і надоўга захаваў у сэрцы. У апавяданні «Рыжык» галоўны герой былы інжынер Вадзім пасля шматгадовай працы выйшаў на заслужаную пенсію. Доўгі час не мог прыняць свой узрост і новы статус. «“Старасць — як латанае-пералатанае адзенне: на чужых плячах яна заўсёды выглядае больш зношанай, чым на сваіх”, — падумаў Вадзім у той дзень, калі яму споўнілася шэсцьдзесят». Дапамагло хобі і выпадкова знойдзены сябар — стары сабака Рыжык. Нечаканая сустрэча змяніла самаго Вадзіма, які ў сталым узросце знайшоў кагосьці блізкага, хто падзяліў з ім радасць і сум.

Апавяданні Алеся Бадака напоўнены філасафічнымі разважаннямі, якія таленавіта перададзены аўтарам праз звычайныя бытавыя рэчы. І «Партрэт», і «Рыжык» расказваюць пра пажылых людзей, іх праблемы і хваляванні цікавяць чытачоў рознага ўзросту і сацыяльнага статусу.

Паэзія Людмілы Шаўчэнка трагічная, сентыментальная, шчырая. У кароткіх вершаваных радках адлюстраваны боль страты, настальгія па былых радасных імгненнях, роспач і смутак. Паэтэса ўзнімае важныя тэмы, якія датычацца кожнага. Гэта не грамадскія праблемы, не тое, што хвалюе сусвет. Людміла Шаўчэнка піша пра маленькія раны душы, якія мае кожны з нас. Здаецца, голас яе паэзіі — унутраны шэпт, які не дае спаць па начах.

Порой бывает так несладко —
Слов не найдешь, чтоб рассказать…
Ведь жизнь — мудрёная загадка,
Нельзя всего предугадать.

Віктар Праўдзін працягвае агульны лірычны настрой нумара ў сваіх апавяданнях «Пяць цукерак ад фрыца», «Западня», «Па-людску», «Чыстыя рукі». У першым творы чытача ахутвае атмасфера вясковага зімняга вечара. Галоўная гераіня Зоя Іванаўна вярнулася ўспамінамі ў цяжкае ваеннае дзяцінства. Напэўна, у многіх бабуль ёсць гісторыя пра добрага немца са смачнымі цукеркамі. Аднак Зоя Іванаўна атрымала зусім іншы жыццёвы досвед, калі маленькая сямігадовая Зоська амаль не заплаціла жыццём за пяць мятных цукерак. Віктар Праўдзін паказвае, што і сярод ворагаў можна трапіць на добрага чалавека, а можна і памыліцца. «А мне цяпер — усё жыццё ўспамінаць і фашыста Фрыца, і добрага немца Курта…»

Пісьменнік мае схільнасць да «гаворачых» назваў, што можна заўважыць па апавяданні «Чыстыя рукі». Гэта невялічкая і, на першы погляд, простая гісторыя пра карумпіраваных чыноўнікаў. У цэнтры твора — звычайная сям'я. Матуля гатуе сняданак, маленькі сын не хоча ісці ў дзіцячы садок, а імкнецца даглядзець сон, старэйшыя сястрычкі збіраюцца ў школу, а тата спіць пасля начной змены. Здаецца, звычайная карціна сярэднестатыстычнай сям'і. Аднак спакойную цішыню раніцу руйнуе навіна пра высокапастаўленага хабарніка. У галаве не ўкладваецца думка: як такіх людзей дапускаюць да высокіх чыноў? Марыя — галоўная гераіня апавядання — пасля навіны адчувае сябе бруднай, ёй вельмі хочацца памыць рукі. Але маленькі сынок Яська, які яшчэ не зведаў усю несправядлівасць гэтага свету, наіўна смяеца: «Матуля, рукі ж чыстыя!»

Апавяданні «Западня» і «Па-людску» аб'яднаны адзінай тэмай — даўняй сувяззю чалавека і прыроды. Аднак людзі вырашылі, што яны вышэйшыя істоты, самыя разумныя і дасканалыя. Таму цяпер можна забіваць братоў нашых меншых і ганарыцца гэтым. Тонкая сатыра спалучаецца з глыбокім аналізам праблемы, што існуе. У абодвух апавяданнях важную ролю іграюць дзеці — як апошняя надзея на будучыню, дзе чалавек, нарэшце, з павагай і любоўю ставіцца да навакольнага свету.

Сугучна з вершамі Людмілы Шэўчэнкі дзеліцца сваімі думкамі Уладзімір Зязюлін у паэтычным цыкле «Жыць для іншых узнёсласцю радкоў». Зноў філасофскія разважанні пра сэнс жыцця, хуткабежнасць часу, цяжкія падзеі мінулага. Творы паэта нельга аб'яднаць у адну тэму. Быццам кожным вершам аўтар хоча ахапіць новыя і новыя вяршыні. Звязвае іх толькі агульная мелодыя, што адзіным матывам пранізвае радкі.

Вот-вот твоё нарушится молчанье
И ты напишешь что-то, чуть дыша.
И новый стих подарит на прощанье
И сладость губ, и холод палаша.
И будут вновь и радость, и разлука,
И взгляд любви, и слезы, и упрёк.
И будет та, особенная, мука —
Жить для других
возвышенностью строк.

Завяршае рубрыку «Проза» апавяданне Ларысы Бабіновіч «Камень». Падзеі разгортваюцца каля адзінага сына паспяховага адваката Віктара Паўлавіча. Юнак трапіў у рэанімацыю, і ўрачы раяць спадзявацца на цуд. Віктар Паўлавіч не разумее, за што яму такія пакуты. Аднак вопытны доктар, які пабачыў не аднаго цяжкага пацыента, падказвае: не за што, а для чаго. Апавяданне прымушае задумацца, як нават самыя бяскрыўдныя ўчынкі могуць стаць трагедыяй у будучыні. «У кожнага ёсць свая канарэйка, задушаная ў дзяцінстве». Пісьменніца паглыбляе чытача ў складаны свет чалавечых пачуццяў, дзе шмат супярэчнасцяў і ўнутраных барацьбы.

Урубрыцы «Дакументы. Нататкі. Успаміны» Пётр Жаўняровіч расказвае пра малавядомыя літаратурныя і сяброўскія сувязі паміж беларускім класікам Уладзімірам Караткевічам і расійскай паэтэсай, бардам і перакладчыцай Навелай Матвеевай. Аўтар спасылаецца на дзённікавыя нататкі, лісты і ўспаміны розных дзеячаў культуры. Пётр Жаўняровіч прапаноўвае чытачам сёмага нумара «Нёмана» азнаёміцца з лістамі Навелы Матвеевай да Уладзіміра Караткевіча і трыма дароўнымі подпісамі, якія суправаджаюцца каментарыямі аўтара. Лісты і пераклады захоўваюцца ў аддзеле рэдкіх рукапісаў Цэнтральнай нацыянальнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі, кнігі з подпісамі — у працоўным кабінеце беларускага пісьменніка. Усе прыведзеныя матэрыялы публікуюцца ўпершыню. Гэта добрая магчымасць бліжэй пазнаёміцца з вялікім творцам, убачыць генія праз прызму чужога таленту.

Урывак з паэмы «Сёстры міласэрнасці» Валянціны Паліканінай, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Мастацкая літаратура», Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, расказвае пра подзвіг жанчын на вайне. Звычайна ваенныя подзвігі і ахвяры асацыіруюцца з мужнымі салдатамі на полі бою. Аднак Валянціна Паліканіна звярнула ўвагу чытачоў да непрыкметных удзельнікаў крывавых падзей, без якіх вынік вайны мог быць зусім іншы. Гэта сёстры міласэрнасці, медсястрычкі, якія на адным узроўні з самымі вопытнымі байцамі ахвяравалі сабой і ратавалі параненых пад свіст варожых куль.

Публіцыстыка ў гэтым нумары часопіса прадстаўлена інтэрв'ю Кіріла Ладуцькі з намеснікам дырэктара Інстытута Еўропы Другога Пекінскага інстытута замежных моў Сюй Чуаньхуа. Прадметам размовы сталі беларуска-кітайскія літаратурныя сувязі, якія развіваюцца хуткімі тэмпамі. Галоўныя пытанні: ці чытаюць класіку ў Кітаі? Якія тэндэнцыі назіраюцца ў сучаснай кітайскай літаратуры? Ці карыстаецца попытам беларуская літаратура за мяжой? Усе адказы — у нумары.

Лізавета КРУПЯНЬКОВА

Вечная песня пра вечнае

Няма аматара беларускай літаратуры, які б не ведаў, што Уладзімір Караткевіч — геній нацыянальнай гістарычнай прозы. А што да ўсяго і паэт, здагадваецца менш чытачоў. А, паводле яго маці Надзеі Васільеўны, «пісаць, спачатку "бубніць" вершы пачаў гадоў у шэсць». Ды і першымі яго кнігамі былі паэтычныя — «Матчына душа» і «Вячэрнія ветразі», а пасля з'явілася «Мая Іліяда» і пасмяротная «Быў. Ёсць. Буду». Нагадваю пра гэта нездарма. У Выдавецкім доме «Звязда» выйшла кніга яго выбраных вершаў. Падобная ранейшым: «Цвяток радзімы васілька» Максіма Багдановіча, «Уладар ветраў» Алеся Бадака, «Ніткі бліскавіц» Рыгора Барадуліна, «Мой боль і запавет» Генадзя Бураўкіна, зборнікі паэтаў абласных аддзяленняў і іншыя.

Усе яны без указання назвы серыі, але ў блізкім мастацкім афармленні. І ўкладальнік усіх кніг Віктар Шніп. Ды гаворка не пра гэта, а пра тое, што аб'ём выбранага недзе ў межах пяці ўлікова-выдавецкіх аркушаў. Калі ўзяць, для прыкладу, таго ж Максіма Багдановіча, Генадзя Бураўкіна — дык гэта паэзія такога высокага мастакоўскага кшталту, што цяжка адабраць нешта найбольш значнае. А што ўжо казаць пра Рыгора Барадуліна?! Тым больш пра Уладзіміра Караткевіча, у якога што ні прачытаеш — радуе.

Не ведаю, як доўга Віктар Анатольевіч перагортваў старонкі яго паэтычных кніг, але, мяркую, з гэтым справіўся выдатна. Па сваім густе мяркую. Не сумняваюся, што найбольш важнае, напісанае Уладзімірам Караткевічам, у гэтае выбранае ўвайшло. Важна не толькі гэта. Больш-менш поўна прадстаўлены і яго раннія творы. Знаёміцца з імі цікава па той прычыне, што, з аднаго боку, не адразу, вобразна кажучы, ён хапаў быка за рогі, а з другога — відавочна, хоць і паступова, упэўнена знаходзіў сваю тэму, якую, калі пастарацца яе абагульніць, можна вызначыць як Беларусь і беларусы. Не так істотна, пра што напісаны гэтыя творы — пра любасць да родных краявідаў, людзей, якім адрасаваны прысвячэнні, пра каханне лірычнага героя і каханне іншых людзей і, канечне, подступы, хай спачатку як бы кволыя, да гістарычнай тэматыкі з яе нацыянальна выяўленым каларытам.

Апраўдана. што «Бацькаўшчына светлая мая» адкрываецца вершам «Орша». Пісаў яго Уладзімір Караткевіч яшчэ ў 1955 годзе, настаўнічаючы ў адной з вясковых школ ва Украіне. Яго прызнанне ў любові да горада, які даў яму жыццё, набывае такую споведзь, што, нават не маючы голасу, можа назваць песняю, а ён жа меў да ўсяго абсалютны музычны голас:

Яна не бліскучыць красою,
А ў сэрца навек запала,
З паркам сваім змарнелым,
З сваёй Кабыляцкай гарой,
З лянівай сястрой Аршыцай,
Што летам бруіцца памалу
Ў шырокі, як песня наша,
Магутны, сівы Дняпро.

Пранізлівым лірызмам, прыхаванай усмешкай напоўнены верш «Заяц варыць піва». Праз нейкую старонку змешчана «Бацькаўшчына» — ці не першае ўслаўленне роднага краю, якое і дало назву гэтай кнізе. «Балада пра паўстанца Ваўкалака» — таксама ў творчасці Уладзіміра Караткевіча пачатак, але звязаны з адлюстраваннем ім гістарычнай праблематыкі. І «Гісторыя з першым каханне» — тэма, што будзе пазней гучаць у шмат якіх творах.

Так паступова Віктар Шніп, адбіраючы асноўнае з творчасці Уладзіміра Сямёнавіча, імкнецца ўпэўніць чытача, які слаба ведае яго як паэта, наколькі ён арыгінальны, як, не абыходзячы розныя тэмы, мог сказаць пра іх сваё слова. Калі паспрабаваць звесці змест гэтых ранніх твораў з тымі, якія былі напісаны пазней, відаць, як з гадамі з'яўляліся такія акорды, калі лірыка і публічнасць не існавалі асобна, а спалучаліся. Яскравы прыклад — верш «Беларуская песня», напісаны 16 красавіка 1968 года:

Дзе мой край? Там, дзе вечную песню
пяе Белавежа,
Там, дзе Нёман на захадзе помніць
варожую кроў,
Дзе на ўзвышшах Наваградскіх
дрэмлюць суровыя вежы
І вішнёвыя хаты глядзяцца
ў шырокі Дняпро.
Ты ляжыш там, дзе сіняя Прыпяць
ласкава вецца,
Дзе Сафія плыве над Дзвіною,
нібы карабель...
Там, дзе сэрца маё з першым крокам,
як молат, заб'ецца,
Калі б нават сляпым і глухім
я прыйшоў да цябе.

Пералік таго, што звязана з родным краем, паўтараецца, але ён не «абцяжарвае» ўспрыманне, бо згадваюцца рэаліі, дарагія не толькі кожнаму беларусу, але і прадстаўнікам іншых народаў, якія лічаць Беларусь сваёй Радзімай: «Дзе мой край? Там, дзе мудрыя продкі // Дзе жанчыны, як радасны сон у стагах на зары, // А дзяўчаты, як дождж залаты. А сівыя матулі, // Як жніўё з павуціннем і добрае сонца ўгары. // Там звіняць неўміручыя песні на поўныя грудзі, // Там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок». Хіба можна не шанаваць такі край, не любавацца ім?!

Ты — наш сцяг, што нікому,
нікому на свеце, нікому
Не дамо абсмяяць, апаганіць,
забыць ці мячом звяваць.
Мы клянёмся табе баразной сваёй
першай на полі
І апошняй раллёй, на якую ўпадзём
у журбе.
Мы клянёмся табе, што ніколі,
Ніколі,
Ніколі,
Так,
Ніколі не кінем,
Не кінем,
Не кінем цябе.

А які глыбокі сэнс закладзены ў вершы «На Беларусі Бог жыве»! Ідучы ад вядомага народнага выслоўя, Караткевіч-паэт сцісла і ў той жа час пераканаўча, абгрунтавана выказвае тое, што ў яго празаічных творах набывае аб'ёмнае гучанне, публіцыстычную рэальнасць, заснаваную на тагачасных падзеях, звернутых у нашу сучаснасць. Інакш і быць не можа, бо «"На Беларусі Бог жыве", — // Так кажа мой просты народ. // Тую праўду сцвярджае раса ў траве // І адвечны зор карагод», «Нам ёсць што піць, // З падмосткаў ліць, // Чым палі свае акрапіць, // А як давядзе, то ёсць нам дзе // І ворага ўтапіць». Найбольш глыбокі сэнс закладзены ў гэтыя радкі:

А калі ён пашле на нас кару і гнеў,
Ну што ж — мы з ім свае:
Ў вяршыні самых гонкіх дрэў
Маланка з неба б'е.

У вяршыні маленькіх і ніцых дрэў
Маланка ніколі не б'е.

І пра тое кожны пяе салавей
Росным кветкам у роднай траве:
«На Беларусі Бог жыве».
І няхай давеку жыве.

Гэты ж верш надзіва актуальны: «Абяцаюць нам новы раскошны дом, // Але тут нам жыць і кахаць, // Тут пад кожным навекі здабытым бугром // Нашы продкі забітыя спяць. // Яны аддалі нам меч і касу, Слова з вуснаў, цяпер нямых... // І нам немагчыма пайсці адсюль // І пакінуць са смерцю іх».

Завяршаецца кніга вершам, напісаным Уладзірам Караткевічам за год да яго заўчаснай смерці:

Можна ўсё: пусціць каханне дымам,
Ўзяць і занядбаць мінулы шлях.
Але толькі — не любіць Радзімы
З чорнаю павязкай на вушах,
З чорнаю павязкай на вачах.
Толькі слухаць словы нездрадлівыя,
Толькі не тлуміць яе маной,
Бо адным мы вінны, пакуль жывы,
Перад нашаю вялікай нівай:
Праўдай абавязаны мы ёй.
Ісцінай.
Адзінаю.
Адной.

Гэта — запавет Уладзіміра Сямёнавіча, але не дэкларавана, як у сяго-таго з паэтаў, калі словы правільныя, дзеянні нібыта абгрунтоўваюцца патрэбныя, а ў самога ў душы пустата, а то і абыякавасць да таго, што адбываецца наўкола. Для Уладзіміра ж Караткевіча тое, што ён гаварыў, было яго ўнутранай праграмай, якая з пражытымі гадамі не мянялася, бо жыў па высокім рахунку сумлення. Падабаецца мне і верш, вынесены на трэцюю старонку (на другой — кароткая біяграфія):

Радок бяззбройны і бясспрэчны
Слабым — адзіна верны шчыт.
І не знікаць Паэтам вечна,
У вечнай Песні жывучы!

Калі пайду з юдолі гора,
Не скончыўшы найлепшы сказ,
То божы свет мяне паўторыць,
Як паўтараў ужо не раз.

Як моры, зоры і азёры,
Якія ў вечнасць забяру.

Свет шчодры,
Свет мяне паўторыць…

Ну а не свет,
дык Беларусь.
Мне — досыць.

Ужо гэтым шмат сказана, аднак не менш гавораць і яго вершы, якія ўвайшлі ў кнігу «Бацькаўшчына светлая мая».

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Чытацкі дзённік
Навума Гальпяровіча

Нагода для роздуму

Чаму люблю такую прозу, гэты так званы «нон-фікшн»? Яшчэ калі ўпершыню прачытаў «Жменю сонечных промняў» Янкі Брыля, адчуў нейкае ціхае суладдзе з душой блізкай, з думкамі і пачуццямі аўтара, і так хораша стала, нібыта ў хвіліны прасвятлення і еднасці пачуццяў. Брыль адкрыў дарогу да гэтага жанру, які паступова стаў не толькі лабараторыяй, а паўнавартаснай мастацкай прозай.

Андрэй Федарэнка і яго «Сечка»... Не раз вяртаўся да старонак, думак і ўражанняў пісьменніка, нібыта знаёмага па жыцці, але прыемна адкрытага: глыбокага і ўдумлівага, з неардынарнымі і цікавымі развагамі.

Чытаю: «Хацелася, каб гэтыя мініяцюры былі россыпам маленькіх літаратурных аб'ектыўных знаходак, цікавых і дарагіх мне, аўтару, і некаторым маім аднадумцам». Аўтар нібы сумняваецца і патрабавальна глядзіць на толькі што напісанае, але не кідае свой маналог, а праз яго паўстаюць і сучаснікі, і прачытаныя класікі. Галоўнае ж — россып разважанняў пра творчасць і сутнасць жыцця. «Даўно марыў: вось выпішуся, "пераплаўлю" чарнавыя загатоўкі ў мастацкія творы і, калі больш рабіць не будзе чаго, не застанецца ніводнага сюжэта, вартага аповесці альбо апавядання, прымуся нарэшце за мініяцюры». Пісьменнік нібыта нават апраўдваецца, бо прынята ж у нас лічыць сапраўднай творчасцю раман, аповесць ці апавяданне, а тут — «Сечка», як назваў свае зацемкі сам Федарэнка.

Цікава было чытаць пра свайго сябра Алеся Пісьмянкова, ад якога, дарэчы, пры яго жыцці чуў шмат цёплых слоў пра Андрэя. У знаёмым, здаецца, вобразе для мяне важна, наколькі блізкія былі думкі і разважанні сяброў пра жыццё, літаратуру, пра лёс мовы і роднай краіны. Уражвае веданне аўтарам рускай і сусветнай літаратуры. Прынамсі, для мяне нават пэўным адкрыццём стала тое, што напісаў Андрэй пра Гогаля, Дастаеўскага, Чэхава, Булгакава… Блізка мне гэта яшчэ і таму, што чытанне і перачытванне літаратурных шэдэўраў дае шырокае поле для ўласных думак і разважанняў і не дазваляе замыкацца ў вузкім коле традыцыйных уяўленняў і ацэнак.

«…я адчуваю проста фізічную насалоду, калі адшукваецца хоць… маленечкая знаходка, доўга потым у адзіноце любуюся гэтай вымытай з тонаў шлаку залацінкай, не жадаючы з ёю развітвацца, не хочучы несці ў "скупны пункт", інакш — друкаваць». Як гэта актуальна цяпер, калі ў «скупны пункт» некаторыя творцы гатовы аддаць скараспелыя і нават часам толкам не вычытаныя «перлы»!

Увогуле, шчырасць у выказваннях і ацэнках — рэч даволі рызыкоўная. Федарэнку нават у свой час «даставалася» ад некаторых сяброў па творчасці: не ўсе прынялі яго пасылы. А для мяне «Сечка» аказалася якраз нагодай да роздуму, россыпам, як сам адзначыў аўтар, «залацінак» і, урэшце, проста цікавым чытвом.

Валянцін СЕМЯНЯКА

Дыханне восені

Я чую дыханне восені —
халоднае, нават злое.
Яно усё больш выразнейшым
становіцца з кожным днём.
А лета, няспетай песняю
азваўшыся за гарою,
Спяшаецца ў нябе жнівеньскім
птушыным махнуць крылом.
Яно яшчэ нас парадуе —
і водарам позніх кветак,
І звонкім бусліным клёкатам,
і плёнам густых садоў.
Ды ліст недарэмна падае
з бярэзіны на палетак,
Каб разам з асеннім клопатам
інакшы стварыць настрой.
Здаецца, яшчэ па-летняму
глядзяцца наўкол абшары,
І сонца нам усміхаецца
і лашчыць зямлю цяплом.
Але ўсё часцей няветліва
з'яўляюцца ў небе хмары,
А дожджык ізноў збіраецца
расплакацца за акном.
…Я чую дыханне восені,
нібыта прысуд суровы —
Дарэмна прасіць і каяцца,
дарэмна хаваць спадзеў.
А лёс, як узор пад кроснамі —
прыгожы і адмысловы,
Ды лета ў ім не вяртаецца,
а восень я праглядзеў.

Дзе знайсці?

Дзе знайсці мне тыя словы,
каб змагла ты ў іх паверыць?
Дзе мне фарбы ўзяць такія,
каб пачуцці апісаць?
Можа, ў зелені вясновай
далікатнасці пазычыць
ці адценні трапяткія
у вясёлкі першай ўзяць?
— Не! Няма такіх зваротаў,
каб адкрыць таемнасць тую,
што так велічна хавае
прыгажосць вачэй тваіх.
І нідзе чароўных нотаў,
безумоўна, не знайду я,
каб агучыць, як спявае
сэрца, калі бачу іх.
Хоць слабая мая песня,
ды, прыпаўшы на калені,
зноў нясу табе прызнанне,
захапленне і любоў.
Так, напэўна, на прадвесні
жаўрукі пяюць без сцэны
і не кожны спеў іх ранні
чуе ў ціхім сне палёў.
…Ты ласкава мне ўсміхнешся —
нібы сонейка заззяе.
Я цяпло усмешкі гэтай
у сабе заўжды нашу.
І заўважыў я, што нешта
па жыцці мы ўсе шукаем —
словы, музыку, сюжэты
і цнатлівую душу.

Ты прыйшла!

Ты прыйшла ў гэты свет
прыгажосцю здзіўляць,
Абнадзейваць і радаваць душы.
Ты прыйшла, каб усмешкай
сваёй саграваць
Акалелыя сэрцы ад сцюжы.
Без цябе тут і сумна,
і змрочна было.
Ты прыйшла і рассыпала фарбы.
І адразу навокал усё расцвіло
Дываномі нязведаных скарбаў.
Ты прыйшла ў гэты свет,
ты ідзеш па жыцці,
Раздаеш, не шкадуючы, шчырасць.
Ты адкрыта для ўсіх,
ды не кожны спасціг,
Што твая азначае адкрытасць.
Столькі сееш вакол дабраты і цяпла,
Столькі дорыш свайго аптымізму!
Ты прыйшла ў гэты свет!
Ты прыйшла!
Ты прыйшла,
Каб здзіўляць хараством і харызмай!

* * *

Нам жыццём адмерана
Кожнаму па-рознаму:
То шаша вялікая,
То сцяжынка росная.

Толькі крыж, што дадзены,
Мы нясём аднолькава:
Падаем, дзе ўпадзіны,
Устаем і войкаем.

А затым збіраемся
З сіламі патроху.
Ад бруду атрасаемся,
Ды зноў – у дарогу!

Нам жыццё адмервае
Па заслугах кожнаму:
Хтось ідзе дарогаю.
Я — сцяжынкай роснаю.

Ала КЛЕМЯНОК

Дзяўчынцы з Вішнёвага завулка

Час выспявання вішань — лепшы час!
І мы, навыпарадкі са шпакамі,
да ягад цягнемся мурзатымі рукамі.
Нішто на свеце не спыняе нас.

Спрытнейшыя палезлі на камель,
смялейшыя — амаль пад самай кронай.
Над імі сонца летняе каронай.
Гудзіць над імі разлаваны чмель.

Яны смачнейшых набяруць пладоў
і будуць костачкамі
з вышыні страляцца.
Як нам хацелася тады вышэй узняцца!
На самы пік вішнёвых тых садоў.

Бы тыя вішні, адцвіло наша жыццё…
Калі ж дзяцінства ажывае
ў сне раптоўна,
цябе там бачу, мілая Пятроўна,
дзе кожны новы дзень, як адкрыццё.

Дзе ўсё яшчэ наперадзе для нас,
і ў Кучугуры можна ездзіць са сталіцы.
Вада не ўскаламучана ў крыніцах.
Мір абяцае
наш Вішнёвы Спас.

* * *

Павуцінка тонкая надзеі
зачапілася за веснічкі мае.
Як уступ да нейкай важнай дзеі,
як з'яўленні рэдкія твае.

Дзе быў сон, а што было на яве —
сёння не істотна для мяне.
Не шукаю тлумачэнняў з'яве,
што злучае нас з табой у сне.

Так рэальна, так матэрыяльна
адчуваю рук тваіх цяпло.
Можа, сон тлумачыцца банальна:
у жыцці кахання не было?

Паміж намі сотні кіламетраў
і няма спадзеву на працяг…
Павуцінка тонкая надзеі
нада мной трапечыцца, як сцяг.

Рапсодыя

Я пяшчоту шукала
па ягадцы ў лесе жыцця
і збірала яе асалоду
ў жбанок, каб хапіла надоўга.
Толькі ўсё забірала
на сконе адвенту Куцця:
жабраку — найсмачнейшае
па хрысціянскаму доўгу.

Мне букеты складалі
з вясёлак пасля навальніц
нескароныя мроі і
непераможныя глупствы.
У экстазе калені згінала
і падала ніц,
эйфарыі бязглуздай
адчуўшы душою наступствы.

Найпяшчотныя словы цадзіў
разамлелы Сусвет
у радкі маіх вершаў
малозівам зорнай каровы,
ды спазняўся цягнік мой
заўжды на святочны абед,
а назаўтра хаміў
і зласловіў рэдактар чарговы.

Вершы — сведкі пачуццяў маіх
і спрадвечных параз
сарамліва хаваліся ў стосы
чужога натхнення.
Іх згубіўшы навек,
пачынала ў стотысячны раз
песню новай пяшчоты
мелодыяй светлай малення.

* * *

Сваімі вершамі кармлю агонь.
Ён прагавіта паглынае сшыткі,
і цягне сваю хцівую далонь,
і скача, як вар'ят каля кібіткі,
што прыпынілася ў нядобры час
не там і не затым, каб карагодзіць.
Пакуль імпэт вар'ята не пагас,
яго я буду вершамі лагодзіць.
Глытай іх, не чытаючы, глытай!
Хай сыдуць попелам мае клікунствы.
На капішчы душы маёй няхай
згараюць мары і прадбачанне дзікунства.
Бо ўсё, што занатоўвала ў радкі,
як у нядобрай казцы, ажывала.
Зніючай, агонь! А я на ўсе бакі
развею попел ад таго, што змарнавала…

Таццяна АБУХОЎСКАЯ

Масты сугучнасці

Мастам складаем сёння гімн хвалебны,
Вітаючы цябе, шаноўны госць!
Масты ўсім людзям на зямлі патрэбны,
Ды шчасце, што яны між намі ёсць!
Масты сяброўства і масты кахання, —
У творчасць мост з ахвотай абірай,
Масты даюць адказы на пытанні,
Як упрыгожыць мілы сэрцу край.

Мы будаваць масты дзяцей навучым,
Ды з пэўнай годнасцю па іх ісці,
Учынкаў добрых слаўнае сугучча
Складаць бацькам на радасць у жыцці.

Каб кожны нёс святло,
хто колькі можа,
Тады б мы беды ўсе перамаглі.
Жыццё, сябры, яно гучыць прыгожа
Пад мірным небам на сваёй зямлі.

Сугучнасць думак,
ды сугучнасць фарбаў,
Павінна ў кожным сэрцы панаваць,
Ды спадчыны святло цудоўных скарбаў,
Што вельмі-вельмі трэба шанаваць!

Нашчадак добрым вырасце і чулым
І госця будзе шчыра прывячаць,
Між будучым,
сучасным і мінулым
Масты чароўнай песняю гучаць.
Прыгожую сугучнасць падгадаем
З гасцямі, што прыехалі здалля,
Бо разам песню гэтую складаем
Пад назвай «Беларуская зямля»!

Княжаводцы[1]

Нашчадак, зберажы для сэрца чулага
І літарамі памяці пішы
Трагедыю ваеннага мінулага,
І захавай у скарбніцы душы.

Каб ведалі і дзеці, і дарослыя,
Праходзячы зямныя рубяжы,
Што тут заўжды былі
палеткі росныя,
І жыта сеялі, бо ўсе хацелі жыць.

І плыў вянок,
рукой дзявочай сплецены
Па сініх хвалях Нёмна ў нікуды…
Ды толькі тое лета сорак трэцяга
Жывым запомніць трэба назаўжды.

Як Княжаводцы ахапіла полымя,
Вакол шатанскі гоман быў і свіст,
Як дзетак, паўраздзетымі і голымі
Кідаў у яму чорную фашыст.

Жывых… І людзі галасілі, енчылі,
Дарослых вораг куляй забіваў.
Матулі перад лютым зверам кленчылі,
Каб хоць дзяцей малых пашкадаваў.

А кат уздзеў з агіднаю усмешкаю
На востры штык грудное немаўля.
Напаўжывых закопвалі з паспешкаю,
І доўга варушылася зямля.

Напаўжывых сырым пяском засыпалі,
Хоць вораг ведаў —
прыйдзе помсты час.
Падзеі тыя з памяці не выпалі.
Яны жывуць у памяці у нас.

Над намі неба мірнае, бяспечнае,
Але ж цаной заплачана якой!
Хай на зямлі ім будзе памяць вечная,
І вечны будзе ў небе ім спакой!

[1] Вёска ў Мастоўскім раёне, «вогненная» сястра Хатыні.

Са сховаў душы

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

Пятрусь Броўка

Першы раз я ўбачыў блізка «жывых пісьменнікаў», калі мне было чатырнаццаць гадоў: у Полацкім Доме афіцэраў на сцэне ў вялікай зале сядзелі ўдзельнікі дэкады рускай літаратуры. Я цяпер не прыгадаю ўсе імёны, некаторыя чуў упершыню, але яркай постаццю быў на гэтай сустрэчы Міхаіл Святлоў. Памятаю яго крыху картавую гаворку і славутую «Гренаду», якую ён чытаў пад гарачыя воплескі прысутных.

Побач з ім вядучым вечарыны быў Пятрусь Броўка, якога я ведаў як класіка беларускай літаратуры, творчасць якога мы вывучалі ў школе. Знешне ён быў падобны на звычайнага вясковага дзядзьку, такіх я нямала бачыў і ў нашым прыгарадным пасёлку, і на вуліцах Полацка. Броўка ўспамінаў, што свой першы верш надрукаваў у полацкай газеце, і мне было прыемна гэта яшчэ і таму, што ў гэтай газеце апублікавана мая першая заметка пра школьнае жыццё.

Увогуле ж, на гэтую сустрэчу я трапіў досыць выпадкова: маме ў саўгасе, дзе яна працавала, далі запрашальны білет, а яна аддала яго мне, сказаўшы: «Табе будзе больш карысна». Казала мама праўду: з тае сустрэчы я ўсур'ёз захапіўся літаратурай і пачаў марыць стаць пісьменнікам. Праўда, гэтая мара была высокая і рамантычная, і я яшчэ не мог тады ўявіць, што буду працаваць у нашай полацкай газеце, пазнаёмлюся з Петрусём Броўкам і нават атрымаю яго аўтограф.

Першая сустрэча адбылася там жа, у Доме афіцэраў, калі Броўка прыязджаў у горад як дэпутат Вярхоўнага Савета. Я тады ўжо быў карэспандэнтам мясцовай газеты «Сцяг камунізму» і пісаў рэпартаж пра гэтую падзею. Пасля выступлення госця падышоў да Пятра Усцінавіча, назваў сябе і сказаў, што наша літаб'яднанне «Наддзвінне» вельмі шануе аднаго са сваіх заснавальнікаў, што на стэндзе ў рэдакцыі вісіць ксеракопія старонкі ў газеце з яго першым вершам. Знакаміты зямляк вельмі прыхільна паставіўся да паведамлення, стаў распытваць пра сённяшні стан літаб'яднання і мясцовых творцаў.

— Калі хто будзе ў Мінску, заходзьце, прыносьце свае вершы.

Дарэчы, па ўспамінах некаторых маіх калег, Броўка заўсёды прыхільна ставіўся да маладых творцаў. Незабыўны Ганад Чарказян не раз гаварыў, што свайму дэбюту на старонках беларускіх выданняў абавязаны Пятру Усцінавічу.

На наступную сустрэчу з вядомым паэтам я прыйшоў ужо з двухтомнікам яго вершаў. Пятро Усцінавіч пазнаў мяне, зноў пацікавіўся нашымі справамі і прыгожым почыркам падпісаў на першым томе: «Паважанаму Навуму Гальпяровічу на добры ўспамін. Пятрусь Броўка. 17.08.77г.». Гэта ўвогуле быў першы такі аўтограф для мяне і кім падпісаны!

Апошні раз я бачыў Пятра Усцінавіча ўжо ў Наваполацку. Ён чарговы раз вылучаўся ў дэпутаты Вярхоўнага Савета. Вялікая зала Палаца культуры нафтаперапрацоўшчыкаў была запоўнена да канца. Сярод прысутных, а гэта ў асноўным працаўнікі найбуйнейшых у горадзе нафтаперапрацоўчага завода і вытворчага аб'яднання «Палімір», не ўсе былі добра знаёмыя з арыгінальнай творчасцю выступоўцы: многія пераехалі ў горад з розных куткоў Расіі, іншых савецкіх рэспублік і па-беларуску не маглі чытаць Броўкавы вершы. Але для іх ён быў, тым не менш, лаўрэатам Ленінскай прэміі за кнігу ў рускім перакладзе, заснавальнікам і кіраўніком Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. І размова ішла не пра літаратуру, а пра надзённыя справы людзей, пра вытворчыя і сацыяльныя праблемы.

Броўка быў ужо хворы: цяжка гаварыў, голас быў сіплы, як прастуджаны. Але трымаўся мужна і годна. Я не рашыўся падысці да яго, і наша апошняя сустрэча засталася толькі ў памяці.

Родныя Броўкавы Пуцілкавічы на Ушаччыне я наведваю, калі бываю на сваёй радзіме, балазе гэта недалёка ад майго Полацка. Успамінаю славутыя радкі паэта:

Я не магу на вас забыцца,
Вы ўсе са мной,
Як нават сплю.
Не, вы скажыце, вы скажыце,
Чаму я гэтак вас люблю?

Бярозу тую — мнагаплачку,
Што ля бацькоўскага двара,
І тую рэчачку Вушачку,
Якой далёка да Дняпра...

Гэтыя радкі сталі песняй. «Песняры» зрабілі верш папулярным, у цудоўным выкананні Леаніда Барткевіча ён кранае душы многіх слухачоў. А я бачу перад сабой тую Ушачку, на берагах якой бываў не раз. І вёску Пуцілкавічы, дзе сёння ў звычайнай вясковай хаце размясціўся музей Петруся Броўкі.

Творца жартаваў, што яго род найстаражытнейшы на Ушаччыне, бо продкаў па бацьку звалі Адам і Ева — Адам Іосіфавіч Броўка і Ева Іванаўна Тарасевіч. Сам Пятрусь Броўка нарадзіўся ў сям'і Юстына Адамавіча і Алены Сцяпанаўны ў вёсцы Пуцілкавічы, якая ўваходзіла на той час у Велікадолецкую воласць Барысаўскага павета Мінскай губерні.

Ва ўспамінах «Пра Петруся Броўку» яшчэ адзін ушачанін Васіль Быкаў адзначыў: «Жыццё паэта — частка духоўнага вопыту народа, а кожны народ шануе, збірае да аднае скарбонкі свой духоўны вопыт, без якога ён — не народ, а толькі вялікая ці малая грамада людзей».

Дзівосны край — гэтая Ушаччына! Азёры, узгоркі, палі і лясы… Неўрадлівая глеба, камяні… Ды надта ўрадлівая на добрых людзей, на сапраўдныя народныя таленты. Нібы прырода давала іх узамен за тыя цяжкасці, якімі надзяліла сялянскую працу, здабыванне хлеба надзённага.

Анатоль Вярцінскі

Мой аднакурснік па журфаку Ігар быў тыповым па тых часах «мажорам»: бабуля — вядомы дыпламат, дзед — былы партыйны работнік, загадчык кафедры гісторыі КПСС аднаго з ВНУ. Мне ён прапанаваў пажыць на перыяд сесіі ў іх пяціпакаёвай кватэры ў цэкоўскім доме па вуліцы Кірава.

Вялікай цікавасці да вучобы ў Ігара не было, як, зрэшты, і да літаратуры. І я быў надта здзіўлены, калі ён аднойчы прынёс кніжачку паэзіі Анатоля Вярцінскага «Чалавечы знак».

— Вось, не пра росныя сцяжынкі піша чувак, — заявіў Ігар, — пачытай!

Я ўжо чуў пра паэта, але гэтай кнігі яшчэ не бачыў. Разгарнуў і знайшоў радкі:

Дзівак чалавек…
Яму — Хірасіму, Асвенцім,
яму, замест імя, —
асвенцімскае таўро.
А ён паўтарае,
што ёсць дабро на свеце,
што будзе дабро
і што пераможа дабро…

Знешне каструбаваты, рацыянальны стыль быў так непадобны на пявучыя радкі іншых беларускіх паэтаў, што вызначала аўтара як незвычайнага сучаснага творцу. Па-сучаснаму ён выглядаў і на здымку ў кнізе модны скураны пінжак, вадалазка. Не ведаў я тады, што лёс мне падорыць калі не сяброўства, дык проста прыязныя таварыскія адносіны з аўтарам гэтай кнігі.

Нам памагае ўбачыць Час:
тут — толькі попел,
там — алмаз,
тут — зерне,
там — палова,
тут — пустазвонства гучных фраз,
там — ісціннае слова.

Далей я пераканаўся, што аўтар любіў гумар, іронію, вострае слаўцо і вельмі не любіў хітрасць і прыстасаванства.

Мы, маладыя пісьменнікі, з хваляваннем заходзілі ў яшчэ стары будынак Саюза пісьменнікаў, які нам здаваўся сапраўдным Парнасам. Анатоль Ільіч Вярцінскі, які тады працаваў кансультантам, — адным з тамашніх багоў.

Неўзабаве я ўбачыў Вярцінскага падчас аднаго з семінараў творчай моладзі, які праводзілі Віцебскі абкам камсамола і абласное літаратурнае аб'яднанне на Браслаўшчыне. Паэт быў запрошаным экспертам і настаўнікам маладых. Без пыхі, ветлівы і ўсмешлівы, ён спадабаўся нам і сваімі думкамі пра паэзію, і ўдзелам у нашых сяброўскіх сумоўях у маляўнічых куточках вакол возера Дрывяты, дзе праходзіў семінар.

Там, ля вогнішча, пад спевы пад гітару, мы шмат гаварылі пра літаратуру, а Анатоль Ільіч не карыстаўся сваім правам настаўніка, а больш слухаў, часта ўстаўляючы трапныя рэплікі.

Час ішоў, я пачаў працаваць уласным карэспандэнтам Беларускага радыё, часцей наведваў Мінск, Анатоль Ільіч стаў рэдактарам штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», з якім я супрацоўнічаў, і вось аднойчы Вярцінскі патэлефанаваў мне і выказаў падзяку за артыкул пра стан і лёс беларускай мовы. Мне было прыемна чуць такі водгук ад шаноўнага пісьменніка і земляка, які натхніў мяне на новыя допісы ў газету творчай інтэлігенцыі.

Мае рэпартажы часта гучалі па радыё, і мне было прыемна, што і пісьменнікі таксама слухаюць весткі з Віцебшчыны. Пры нашых сустрэчах Вярцінскі нават жартаваў: «Паслухаю голас Навума, і адразу ўзнікае жаданне паехаць на радзіму».

А родныя мясціны Анатоля Ільіча — Верхнядзвіншчына. Нарадзіўся Анатоль Ільіч Вярцінскі 18 лістапада 1931 г. у в. Дзямешкава Лепельскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Адзінаццацігадовым хлапчуком падвозіў ноччу ў Саснягоўскую пушчу партызан, расклейваў у роднай вёсцы лістоўкі...

Чуеш, як птушка спявае?
У песні яе жывой —
голас роднага краю,
голас Радзімы тваёй.
Бачыш, як сад кветнее,
як ззяе на лузе раса?
То роднага краю надзея,
то любай Радзімы краса.

Мне даводзілася не раз разам з Анатолем Ільічом бываць у яго родных мясцінах, бачыў і чуў, як шануюць лепяльчане свайго земляка. А паколькі да майго Полацка ад Лепеля ўсяго семдзесят кіламетраў, то мы з Вярцінскім таксама чуліся землякамі. Дарэчы, як і Васіль Быкаў распавядаў, Вярцінскі таксама расказваў: калі ў іхняй вёсцы казалі «паехаць у горад», то гэта азначала — у Полацк.

У адным сваім вершы напрыканцы жыцця паэт пісаў:

Калі раным-рана ў кватэры маёй —
то ранняй вясной, то позняй зімой, —
званок прагучыць тэлефонны,
ня звыклы, не будзённы,
а нейкі адметны зусім
па тону, па тэмбру сваім,
званок ласкава-тонкі,
па-святочнаму звонкі, —
яго я адразу пазнаю,
я хуценька трубку здымаю
і… чую Лепельшчыну сваю,
голас бацькоўскага краю.
Не забывае Лепель мяне.

У сваю чаргу Анатоль Ільіч не забываўся пра сваіх лепяльчан. Спрыяў мясцовым літаратарам, бардам, самадзейным артыстам. Мне даводзілася разам з ім удзельнічаць у творчых імпрэзах прадстаўнікоў Лепельшчыны і на сцэне тэатра «Зніч» у Мінску, і ў сталічным Доме літаратара.

Памятны дзень у маі 1990 года, калі мяне прымалі ў Саюз пісьменнікаў. Тайнае галасаванне мэтраў беларускай літаратуры, сярод якіх быў і Анатоль Ільіч. Хваляванне, радасць, сяброўская размова, якая зацягнулася за поўнач… Мы з Анатолем Ільічом ішлі па парку Горкага і гаварылі, гаварылі... Я праводзіў яго дадому, а сам неўзабаве паехаў у Полацк.

А калі я пераехаў у Мінск, стаў працаваць у «Вожыку», а затым мяне абралі намеснікам старшыні Саюза пісьменнікаў, нашы стасункі з Вярцінскім сталі частымі і сапраўды сяброўскімі. Не раз мы сустракаліся на розных імпрэзах і проста ў сябрынах, калі да нас далучаўся Алесь Пісьмянкоў, які ў той час займаў тую ж пасаду, што некалі і Вярцінскі.

Анатоль Ільіч вельмі адказна ставіўся да выступленняў. Не сказаць, каб ён быў выдатны прамоўца: паведаміць хацелася многае, амаль кожны раз у яго былі лісткі з патрэбнымі цытатамі, але такога плаўнага прыгожага тэмпу, як, напрыклад, у Алеся Савіцкага, у яго прамовах не было. Таму аднойчы я, калі быў вядучым, не адразу даў яму слова, а выпусціў праз двух прамоўцаў. Тады, памятаю, Анатоль Ільіч дужа пакрыўдзіўся, бо хацеў выказацца напачатку. Я некалькі разоў папрасіў у яго прабачэння, ды толькі пад вечар ён адышоў.

А праз пэўны час нечакана адбылося тое, што звяло нас з Вярцінскім агульнай працай. Завітаў да мяне ў кабінет літкансультант Яўген Іванавіч Каршукоў і папрасіў прыняць свайго аднакурсніка Вярцінскага на работу да нас, у саюз, на вызваленае месца яшчэ аднаго кансультанта. Я дужа хваляваўся, як змагу кіраваць сваім настаўнікам, класікам нашай паэзіі. Гэта выказаў і Анатолю Ільічу.

— Не бойся, Навум, я буду цябе слухацца, — ці ўсур'ёз, ці жартам адказаў Вярцінскі.

На жаль, папрацаваць нам доўга не давялося: так склаліся абставіны, што я сышоў на пастаянную працу на радыё, а Анатоль Ільіч раней падаў заяву на звальненне. Раз-пораз мы сустракаліся яшчэ, і заўсёды было прыемна пабачыцца і пагаварыць з гэтым цудоўным чалавекам і творцам.

Паэзія Анатоля Вярцінскага панадчасавая, панадузроставая. Разважаючы над мінулым і сённяшнім жыццём чалавецтва, паэт у адным з апошніх вершаў зборніка «Ветрана» сцвярджае:

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Найлепшы самы, самы натуральны
пачатак гэты вось жыццястваральны.
Інакш — якая ад жыцця карысць?
Тварыць!
Жыццё даецца, каб жыццё тварыць,
Не марнаваць, не нішчыць, не бурыць, —
Тварыць!

І ён тварыў сваё жыццё, і жыццё яго вершаў — гэта наша багацце, наша спадчына, наша стварэнне.

І мне пашчасціла дакрануцца не толькі да творчасці паэта, але і да яго жыцця, яго творчых стваральных дзён.

Як для дзяцей, так і для дарослых

На жаль, мала хто ведае, што сярод пачынальнікаў беларускай літаратуры для дзяцей быў і Павел Левановіч. Не толькі апавяданні друкаваў у перыёдыцы, але ў 1938 годзе выдаў кнігу «Дружба». Толькі нядоўгім быў яго жыццёвы шлях, таму і звестак захавалася мала. Нарадзіўся 3 лістапада 1914 года ў вёсцы Мазалава Мсціслаўскага павета, цяпер аднайменны раён на Магілёўшчыне. Ці не адзін з пісьменнікаў, які паступіў на геаграфічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля першага курса прызваны ў Чырвоную Армію, удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі. Скончыўшы ўніверсітэт, працаваў у часопісе «Іскры Ільіча».

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны — на фронце. Ды ваяваў нядоўга. Трапіўшы ў палон, апынуўся ў Крычаўскім лагеры ваеннапалонных. На шчасце, уцёк. Наладзіў сувязь з партызанамі, удзельнічаў у Мсціслаўскім падполлі. А 3 кастрычніка 1943 года зноў у шэрагах Чырвонай Арміі. Аднак у чарговым баі цяжка параніла. Памёр 29 снежня 1943 года, быў пахаваны ў вёсцы Старынка Горацкага раёна.

Нягледзячы на малады ўзрост, працаваў у многіх жанрах. У друку пачаў выступаць у 1934 годзе: паэзія, нарысы, пераклад. Апублікаваў і некалькі апавяданняў для дарослых. Яны, а таксама іншыя ў 1940 годзе ўвашлі ў кнігу, якая была ўхвалена на секцыі прозы Саюза пісьменнікаў. Але рукапіс у вайну згарэў. Што меў немалыя творчыя задаткі, сведчаць апавяданні «На Сожы» і «Каліна-ягада». Першае з іх прысвечана плытагонам, у ім жывапісна ярка выпісаны характары персанажаў, асабліва Кірылы і брыгадзіра плытагонаў Ягора.

Абазначэнне ў канцы апавядання «Мінск, кастрычнік 1939 года» сведчыць аб тым, што гэта быў своеасаблівы водгук Паўла Левановіча на падзеі, сведкам і ўдзельнікам якіх быў. Аднак, пішучы гэты твор, наўрад ці меў перад сабой рэальных прататыпаў галоўных персанажаў. Верагодней за ўсё, вобразы збіральныя. Многіх неаднойчы бачыў, калі радасна віталі прыход часцей Чырвонай Арміі. З іх і «нарадзіліся» Банадысь і Ганка — вяскоўцы, якія перад гэтым арандавалі зямлю ў пана Янткоўскага.

Сітуацыя, пададзеная ў творы, з'яўлялася звыклай для сем'яў, якія з-за беднаты не маглі своечасова заплаціць нядоімку, аддаць падаткі. Тады завітваў аканом і гнеўна нагадваў: «<…> да раніцы, пакуль сонца ўзыдзе, каб і твайго духу не было». Упрошванні: «Пан аканом, дайце часу, усё будзе» наўрад ці далі б нешта, калі б для застрашэння аканом не сказаў галоўнага. Янткоўскі ўсё ж пашкадаваў гэтую сям'ю, але паставіў умову: «Ідзі ў лес, знайдзі каліну, выкапай і пасадзі ля перад палацам пана. Чуеш? Госці будуць любавацца ягадамі».

Банадысь паспяшаўся яго выканаць, а ў лесе, шукаючы каліну, «разгледзеў чорныя ягады крушыны. Яны маленькімі вочкамі глядзелі на яго з усіх бакоў. І ён прыпомніў…» У памяці ажыло даўняе, яшчэ з гадоў яго маладосці. Яно горкае, але і радаснае. Горкае, бо «ў галодны год ён збіраў іх і з жалудовымі праснушкамі еў. Яны падымалі ў жываце калючы боль, і Банадысь захварэў». Радаснае, бо «мабыць, і смерць прыйшла б Банадысю, каб не чалавек з чырвоным акольшам на шапцы. Ён прыйшоў у хату, агледзеў Банадыся і пакінуў яму акраец хлеба, тры гарцы мукі, цукру і самавар».

Рэтраспекцыя набывае важны сэнс, бо, як даведваемся, гэтая сустрэча праз шмат гадоў будзе мець працяг. У іншых абставінах, з іншымі людзьмі. Аднак з адной і той жа сутнасцю ў сваёй аснове: на дабро, на спагаду вартыя толькі тыя, у каго чалавечнасць закладзена самой прыродай, а з гадамі ў іх з'яўляецца нізкі болевы парог, які дазваляе чужыя беды ўспрымаць як свае.

Самавар Банадысь збярог «як самае лепше шчасце». Толькі шкадаваў, што чалавека гэтага не можа больш пабачыць, бо «мяжа праклятая не пускае». Цяпер жа яму ў радасць, што «падатак дараваў пан». То можна і самавар прадаць, «усё роўна ён <…> так стаіць». А за грошы што-небудзь купіць. Два вобразы — самавара і крушыны — у апавяданні сімвалізуюць той дастатак, хай сабе і маленькі, які такі важны для гэтай гаротнай сям'і. Асабліва пасля таго, як Ганка за прададзены самавар купіла яму «квацістую паркалёвую кашулю».

Выкарыстанне гэтых двух вобразаў засведчыла аб уменні Паўла Левановіча аздабляць сюжэт так, каб персанажы раскрываліся не толькі праз дзеянні, але і праз тое, што лучыць іх з навакольлем, у многім уплывае на іх маральны стан, крыху прыўкрашвае гаротнае жыццё. Гэта як вобраз навальніцы ў апавяданні «На Сожы». Аднак у ім усё завяршалася шчасліва, чаго не скажаш пра «Каліну-ягаду». Банадысь выкапаў такое вялікае дрэва, што, несучы яго да маёнтка Янткоўскага, адчуў сябе блага, страціў прытомнасць. Калі ішла жонка, вяртаючыся той дарогай, якой крочыў ён, быў ужо мёртвы.

Яшчэ больш сімвалічна гучыць завяршэнне твора. Але гэты галоўны сімвал узнік не на пустым месцы, а каранямі сваімі звязаны з тым, як у галодны год Банадыся выратаваў ад смерці невядомы «з чырвоным акольшам на шапцы». Праз шмат гадоў Ганка ўбачыла не аднаго невядомага, а некалькі незнаёмцаў. Даведаўшыся, што яе муж мёртвы, яны выклікалі «аўтамашыну з чырвоным крыжом». Калі ўнеслі ў яе Банадыся, яна запыталася:

«— Куды ж вы? Яго трэба памыць, ды і кашулю адзець, — яна падняла кашулю і наважылася яшчэ штосьці сказаць.

— Нічога нам не трэба. У нас усё сваё ёсць. Сядайце, паедзем разам.

— А каліну?

— Каліну?

— Ён нёс пану Янткоўскаму, каб у садзе пасадзіць яе… І надарваўся, — і ў сполаху, што прагаварылася, дадала:

— А вы хто?

— Мы — чырвоныя».

Воінскія могілкі, дзе пахаваны Павел Левановіч.

Калі ствараць анталогію апавяданняў, у якіх закранаецца жыццё працоўных былой Заходняй Беларусі, безумоўна, не абысціся без апавяданняў Паўла Левановіча. Тое самае тычыцца і яго найлепшых твораў для дзяцей, якія так і просяцца ў калектыўныя зборнікі прозы для хлопчыкаў і дзяўчынак, напісаных у 20—30-я гады мінулага стагоддзя. Яны для сучасных маленькіх чытачоў будуць цікавыя, бо ў іх паўстае свет іх аднагодкаў, якія сёння з'яўляюцца ім ужо не толькі бабулямі і дзядулямі, але і прабабулямі і прадзядулямі. Зразумела, што ў іх былі іншыя інтарэсы. Якія? Гэта і відаць з твораў, у якіх адчуваецца лучнасць з прыродай, з яе жывёльным светам. Пры гэтым Павел Левановіч не вышукваў нейкіх арыгінальных сюжэтаў, у пэўнай ступені пісаў як бы з натуры, перадаючы ўбачанае. Асабліва ў апавяданнях, якія напісаны ад імя саміх юных персанажаў. Напрыклад, у «Выпадку ў дарозе».

Як усё адбывалася, расказвае хлопчык Паўлік: «Аднойчы ўвечары бацька збіраўся адвозіць пошту на станцыю. Упакаваў пісьмы ў брызентавы мяшок і чакаў шафёра. Неўзабаве затрубіў ражок, і да ганка пошты пад'ехаў аўтамабіль.

Я пачаў прасіць бацьку ўзяць мяне з сабою, але ён і слухаць не хацеў. Тады я непрыкметна залез у аўтамабіль. Бацька прыйшоў, адчыніў дзверцы і здзівіўся.

— А ты ўжо тут?.. Ну што ж, паедзем, калі так».

Паездка для яго бацькі звычайная, а для Паўліка адкрыццё незвычайнага ў, здавалася б, звычайным. Калі ён «нахінуўся наперад і цераз плячо шафёра ўбачыў, як шэры заяц перабягаў дарогу. Электрычнае святло аспіпела яму вочы, і таму ён выправіўся ўздоўж шасэ. Машына даганяла яго». Хлопчыку стала шкада зайца, ды бацька супакоіў: «Не задушым, машына ідзе памалу». Аднак калі ўз'ехалі на асветлены мост, спалоханы заяц скокнуў уніз. Паўлік убачыў яго, калі выплыў непадалёку ад яго. Далей адбылося вось што: «Я схапіў яго за вушы. Але ён ірвануўся, ударыў нагамі, і я паляцеў у ваду. Моцна сціснуўшы звярка за вушы, я не выпускаў яго з рук».

Пра зайцоў і тагачасныя дзеці нямала чулі. Куды меней яны ведалі пра баброў, таму апавяданне пра іх і называецца «Цікавы звярок», каб прыцягнуць да яго большую ўвагу. Праўда, дзіўнаватым выглядае тое, што апавядальнік, а па змесце твора — адзін са школьнікаў — «па заданні Акадэміі навук намерыўся злавіць» аднаго з іх. Няўжо гэта праўдзіва? Зразумеўшы, што аднаму не справіцца, для падмогі ўзяў з сабой двух паляўнічых: «Напалоханы звярок пачаў жаласліва пішчэць. Яго піск нагадвае радаснае скуголенне сабакі». Хлапчук гэты быў дасведчаны: «Кажуць, што бабры плачуць, можа, яна плача па дзецях».

Іншыя апавяданні таксама цікавыя тым, што прывіваюць любоў да братоў нашых меншых. Як тых, якія жывуць у лесе, так і хатніх. Сярод іх асабліва вылучаецца «Шэрак». Яно пра быка, які «меў круты і віхрасты лоб, вострыя і прамыя рогі з саламяным адценнем… Ён быў шэры ўвесь, таму і празвалі яго Шэрак». Панасіку, які пайшоў у падпаскі да дзядзькі Міхася, Шэрак падабаўся «сваёю рахманасцю і паслухмянасцю». А яшчэ тым, што заўсёды «разганяў сярдзітых жывёл», а Панасіка ўратаваў ад шалёнага сабакі.

Павел Левановіч, як відаць з гэтага апавядання, паэтызуючы вясковае жыццё, не абмінаў і вострых момантаў у ім. Гэтаксама і ў прыродзе, хоць не перашкаджала яму праз юных персанажаў захапляцца прыгажосцю некаторых лясных насельнікаў. Такая сітуацыя пададзена ў апавяданні «Рагаты прыгажун». Хлопчык ранкам «кончыў пракос, навастрыў касу і пачаў новы пракос». І раптам убачыў, што насустрач яму бяжыць лось. Гэты велікан уразіў яго сваім вонкавым выглядам: «Тры разгаліненні рагоў калышуцца над галавою, якую ён нясе паралельна зямлі і сваёй спіны. Галава ў лася пры быстрай хадзе прыгінаецца да спіны, і шырокія рогі не перашкаджаюць прабірацца ў гушчары».

Хлапчук прызнаецца: «Я стаў і дзіўлюся на танканогую прыгожую жывёліну цёмна-гнядой масці, ад сонца яна зрабілася яшчэ прыгажэйшай». Аднак так было нядоўга. Калі «адлегласць паміж намі з кожнай секундай памяншаецца», яму стала страшна. Добра, што ў гэтай сітуацыі знайшоў выйсце. Зазваніў па касе мянташкай, лось спыніўся, а пасля павярнуў у бок. Ды і хутка ўпэўніўся, што нападаць ён не збіраўся. Яго, соннага, разбудзіў сабака апавядальніка Мірсік, які перагрыз вяроўку, за якую быў прывязаны. Паспяшаўся па следу свайго гаспадара і напаткаў лася. Той, спалохаўшыся, пачаў уцякаць.

Як відаць, трывога ў хлапчука была марная. А вось у аснову апавядання «Каса выратавала» пакладзена сітуацыя, якая магла б скончыцца трагічна. Вяртаючыся ў час касавіцы ад суседа-лесніка з касой, хлопчык раптам заўважыў, як з куста выходзіць мядзведзь. Аб яго намеры здагадацца было няцяжка: «Выставіў пярэднія лапы і вось-вось возьме мяне ў абдымку». Ад страху апавядальнік «выпусціў у руку касу і альховую палку». Гэта яго і выратавала: «Палка кранулася касы, каса зазвінела стогалосым рэхам <…> Мядзведзь спалохаўся металічнага звону, зароў немым голасам і пабег ад мяне.

— Гэк, гэк, гэк, — крычаў звер».

Самае лірычнае з апавяданняў — «Пра вавёрачку і кошку», аднак, на жаль, з трагічным зыходам. У ім апавядаецца пра ляснога звярка, якім адзін з хлопчыкаў Толя так захапляецца: «— Паглядзіце, якая яна прыгожая… А роцік які! І вусікі, як у ката». Але, крыху падросшы, вавёрачка і характар праявіла. Гэта і каштавала ёй жыцця: «Вавёрачка ўскочыла на высокі кол і пачала дражніцца з сабакамі. Сабакі бегалі каля плота, але дастаць вавёрачку не маглі. Асмялелы звярок, бачачы, што сабакі не могуць дастаць яго, выгнуў цела дугою і скокнуў з плота на страху. Струхлелая салома абламалася, і вавёрачка паляцела на зямлю. Злосныя сабакі ўмомант накінуліся на яе. Вавёрачка прарэзліва закрычала…» За яе заступілася кошка, «ускочыла на першага сабаку, які трапіўся ёй», але вавёрачка ўжо была мёртвая.

І гэтае апавяданне, і іншыя, як няцяжка заўважыць, прываблівающь і тым, што ў іх прырода, яе жыхары выступаюць як бы паўнакроўнымі персанажамі. Гэта сведчыць на карысць таго, што Павел Левановіч невыпадкова ўзяўся атрымліваць вышэйшую адукацыю менавіта на геаграфічным факультэце. Гэтая навучальная дысцыпліна найбольш прывабліваля. Разумеў, што атрыманыя веды спатрэбяцца ў будучых творах. Інакш бадай і на лесасплаве не працаваў бы. А без працы плытагонам не нарадзілася б і апавяданне «На Сожы». Пражыў бы больш, можна не сумнявацца, што на тэму чалавека і прыроды напісаў бы нямала твораў. І апавяданнямі, хутчэй за ўсё, не абмежаваўся б. Падступіўся і да вялікіх празаічных жанраў. Глядзіш, і раман з'явіўся, як у Віктара Карамазава «Пушча».

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Пляцоўка для творчага росту

Не без падстаў многія майстры прыгожага пісьменства і літаратурныя крытыкі лічаць апавяданне самым складаным жанрам прозы. Часам напісаць бездакорнае апавяданне складаней, чым аповесць альбо нават раман. У беларускай літаратуры гэты жанр дасягнуў сапраўднага росквіту ў мінулым стагоддзі. На ніве апавядання шчыравалі Кузьма Чорны, Іван Мележ, Іван Шамякін, Іван Чыгрынаў, Васіль Быкаў, Вячаслаў Адамчык і іншыя класікі. Імі закладзены трывалы падмурак для развіцця жанру, які захоўвае свае пазіцыі і ў сучаснай айчыннай прозе.

Свой уклад у працэс уносіць і штогадовы конкурс апавяданняў газеты «Звязда». У гэтай традыцыі закладзены вялікі сэнс. Літаратурнае спаборніцтва, якое ладзіць на сваіх старонках адзінае беларускамоўнае грамадска-палітычнае выданне, з'яўляецца творчай лабараторыяй як для вядомых аўтараў, так і для пачаткоўцаў. У такіх варунках апавяданне атрымлівае новы якасны патэнцыял для развіцця. Па сутнасці, на прыкладзе «звяздоўскага» конкурсу маем зрэз сучаснай прозы ў гэтым жанры.

На працягу 2023 года і за перыяд са студзеня да жніўня 2024-га пад рубрыкай «На літаратурны конкурс» у «Звяздзе» было апублікавана 21 апавяданне ад 18 аўтараў (Анатоль Бензярук, Людміла Маркоўская і Сяргей Белаяр удзельнічалі ў творчым спаборніцтве і летась, і сёлета). Зацікаўлены чытач меў магчымасць адзначыць разнастайнасць тэматыкі, ацаніць руплівую працу аўтараў са стылем і формай. Тут і рэалістычная псіхалагічная проза, і мініяцюры, і жаночая навела, і фантастыка — як кажуць, на любы густ.

Асаблівае месца адводзіцца творам, прысвечаным тэме Вялікай Айчыннай вайны і гістарычнай памяці. Анатоль Бензярук малюе вобраз старога выкладчыка: ён сорак гадоў чакае свайго студэнта, які не прыйшоў на пераздачу экзамену 23 чэрвеня 1941 года («Экзамен па гісторыі»). Памірае ад голаду маці сямігадовай Жэні страшнай блакаднай зімой у Ленінградзе, і праз дзесяцігоддзі Яўгеніі Уладзіміраўне, якая цудам выжыла, чуецца прыгожы раманс, які спявала матуля (Людміла Маркоўская «У месячным ззянні»). Алена Руцкая ў «Вечары ўспамінаў» акцэнтуе ўвагу на важнасці гістарычнай памяці для выхавання маладога пакалення.

Складаныя, часам драматычныя жыццёвыя калізіі, сямейна-бытавыя канфлікты, маральныя пошукі паўстаюць са старонак прозы Ніны Рыбік, Іны Фраловай, Алеся Бычкоўскага. Пісьменнікі працуюць у рэчышчы псіхалагічнай прозы, аналізуючы ўнутраны свет сваіх герояў, іх супрацьстаянне лёсу альбо ўласным заганам. Бацька Адаркі ў маладосці трапіў у палон алкагольнай залежнасці, аднак дзякуючы веры ў Бога здолеў узняцца са дна жыцця (Алесь Бычкоўскі «Адарка»). Дзве родныя сястры Сафея і Раіса ў «Вясельным ручніку» Ніны Рыбік па-рознаму паводзяць сябе ў выпрабаваннях, якія падрыхтаваў для іх лёс. Юная Васіліна сутыкаецца са здрадай блізкіх людзей і аказваецца здольнай выстаяць, бо мае вялікую любоў да роднай зямлі (Іна Фралова «Васілёчкі-кветачкі»). Вясковая настаўніца Валянціна Аляксееўна ідзе пешшу ў мароз і завіруху па бездарожжы на пошукі дапамогі, каб уратаваць сваіх вучняў (Людміла Маркоўская «Трынаццаць кіламетраў»). Як бачым, жанчын з моцнымі характарамі ў сучаснай літаратуры хапае.

Наўмысна не называю ў гэтым аглядзе прозвішчы тых, хто ўвайшоў у тройку пераможцаў. Па-першае, мы ўжо віншавалі нашых лідараў на старонках «Звязды» і «ЛіМа», па-другое, можна, на мой погляд, лічыць пераможцамі ўсіх аўтараў, чые тэксты здолелі прайсці ўнутрырэдакцыйны адбор і ўбачылі свет у газеце, бо літаратары данеслі сваё мастацкае слова да шырокага кола чытачоў. Дзякуючы ўдзельнікам «звяздоўскага» конкурсу ў тым ліку сучаснае беларускае апавяданне развіваецца і ўзбагачаецца новымі знаходкамі.

Прадстаўлена і жаночая любоўная навела. Гераіня Наталлі Ніканчук палюе на яркія эмоцыі ў замежным падарожжы («Стрэлы Амура»). Учарашняя выпускніца Аліна стаіць перад дылемай: яна сустракаецца з двума хлопцамі і не можа вырашыць, за каго пайсці замуж (Таццяна Цвірко «Не спазніся»). Ірына Карнаухава прымушае студэнтку Алесю разгадваць сакрэт не зусім звычайнай лялькі — падчас гэтага квэсту дзяўчына сустракае сваё шчасце («Лялька з сумнай усмешкай»).

Зрэшты, пра каханне пішуць не толькі жанчыны. Немалады пісьменнік, герой апавядання Міхася Пазнякова, калісьці ў адвечнай барацьбе паміж пачуццём і абавязкам выбраў абавязак, і праз гады нечаканы ліст ад былой каханай прымусіў яго перажыць складаную гаму пачуццяў («Ліст з мінулага»). А герой Анатоля Бензерука, нягледзячы на сумныя абставіны, у якіх аказаўся пасля аўтакатастрофы, менавіта праз няшчасце сустрэў сваё шчасце («Любоў і каханне»).

Персанажы кароткіх апавяданняў назіральнага Аляксандра Быкава нібыта жывуць сярод нас; дыялогі, сцэнкі, характары, здаецца, занатаваны з натуры («Жалезная баба», «Аўтобус з прыгожага жыцця»). Свята ў праваслаўным храме малюе Алена Кісель; аўтарка здолела паказаць шчырыя пачуцці вернікаў і наіўнасць пажылых людзей, якой карыстаюцца рознага роду жоўтыя часопісы і паблікі («На свечках»). Праблема адасобленасці сучаснага чалавека адно ад аднаго — тэма апавядання Ірыны Тулупавай («Недахоп чалавечых зносін, альбо Век жыві, век вучыся»).

Традыцыйна не забываюцца сучаснікі на братоў нашых меншых. Жанна Міус («Два Кешы») прыводзіць чытача да думкі пра ўзаемасувязь усяго жывога ў гэтым свеце. Тамара Кавальчук паказвае, як дабрыня чалавека да птушкі выратавала яму жыццё («Выратавальнік»). Ірына Войтка запрашае на вясковы падворак, дзе старая Марыя, назіраючы за бусліным гняздом, радуецца вечнаму працягу жыцця («Бабуля і буслы»). Людміла Лазута з гумарам апісвае начное здарэнне: сон паляўнічага парушыла парасё, спрасонку прынятае ім за невядомага звера («Незвычайнае паляванне»).

Без сумневаў, зацікавіць чытачоў і фантастыка — у гэтым жанры стала і з поспехам працуе Сяргей Белаяр, пераможца розных літаратурных конкурсаў, майстар інтрыгі і пакручастага сюжэта. Яго апавяданні «Час назад» і «Агонь мёртвых» сведчаць пра тое, што майстэрства аўтара ў выбраным кірунку ўдасканальваецца. Далёкі космас з яго невытлумачальнымі таямніцамі, паранармальныя з'явы — вось сюжэты яго прозы.

Наўмысна не называю ў гэтым аглядзе прозвішчы тых, хто ўвайшоў у тройку пераможцаў. Па-першае, мы ўжо віншавалі нашых лідараў на старонках «Звязды» і «ЛіМа», па-другое, можна, на мой погляд, лічыць пераможцамі ўсіх аўтараў, чые тэксты здолелі прайсці ўнутрырэдакцыйны адбор і ўбачылі свет у газеце, бо літаратары данеслі сваё мастацкае слова да шырокага кола чытачоў. Дзякуючы ўдзельнікам «звяздоўскага» конкурсу ў тым ліку сучаснае беларускае апавяданне развіваецца і ўзбагачаецца новымі знаходкамі.

Конкурсныя тэксты працягваюць выходзіць. Што ж у рэдакцыйным «партфелі»? Як заўсёды, творы вядомых пісьменнікаў, якія выдалі ўжо не адну кнігу. Работы маладых аўтараў, якія вырашылі скарыстаць конкурс у якасці пляцоўкі для творчага росту. А значыць, ёсць шанц, што будуць адкрыты новыя імёны.

Алена БРАВА

Змагары за свабоду і незалежнасць Заходняй Беларусі

17 верасня ў Беларусі адзначаецца Дзень народнага адзінства — дзяржаўнае свята, заснаванае Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2021 года № 206. Гэта дата — даніна памяці беларусам, якія змагаліся за ўз'яднанне беларускага народа ў адзінай дзяржаве.

У верасні 2024 года спаўняецца 85 гадоў з часу далучэння Заходняй Беларусі да Беларускай ССР. Паэт Максім Танк казаў, што «ніякім зводкам, рэляцыям, пазнейшым сведчанням гісторыкаў не пад сілу перадаць той энтузіязм і радасць, з якімі працоўныя Заходняй Беларусі сустракалі вестку аб уз'яднанні».

14 лістапада 1939 года сесіяй Вярхоўнага Савета БССР быў ухвалены Закон аб уз'яднанні Заходняй Беларусі з БССР, у якім значылася: «Прыняць Заходнюю Беларусь у склад БССР і ўз'яднаць тым самым вялікі беларускі народ у адзінай беларускай дзяржаве».

Заходнія вобласці Беларусі (каля 100 тыс. кв. км. з насельніцтвам звыш 3 млн чалавек) два дзесяцігоддзі былі ў складзе польскай дзяржавы. На гэтых тэрыторыях не было рэалізавана права беларусаў на самавызначэнне, і ім прыйшлося зведаць розныя формы дыскрымінацыі: сацыяльную, нацыянальную, рэлігійную, эканамічную.

Былі закрыты беларускія тэатры, клубы і бібліятэкі. У дзяржаўных установах не дазвалялася выкарыстоўваць беларускую мову. У заходняй Беларусі былі ліквідаваны беларускія школы. Да анексіі працавала каля чатырохсот школ, у 1938/1939 навучальным годзе не засталося ніводнай. У сувязі з высокай платай за навучанне, беднасцю, перашкодамі з боку польскіх улад быў рэзка абмежаваны доступ беларускіх дзяцей у сярэднія школы. Вышэйшыя навучальныя ўстановы для іх былі практычна недаступнымі.

Вынікам такой палітыкі польскіх улад у Заходняй Беларусі стаў моцны нацыянальна-вызваленчы рух. Барацьба беларусаў прымала розныя формы: ад забастовак і дэманстрацый да ўзброеных выступленняў.

Горад Гродна знаходзіўся ў эпіцэнтры падзей дзеянняў Чырвонай Арміі і польскіх войскаў у верасні 1939 года. Менавіта ў Гродне адбыліся сур'ёзныя баі з часцямі польскага войска, якія працягваліся некалькі дзён.

Гродзенская цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. Макаёнка склала біябібліяграфічны даведнік «1939 год. Гродна. Вернутыя імёны» з наступнымі раздзеламі: дзеячы нацыянальна-вызваленчага руху, дзеячы вызваленчага ваеннага паходу Чырвонай Арміі, удзельнікі вызваленчага ваеннага паходу ў Гродне 1939 года, манументальная памяць Гродна 1939 года.

Матэрыял у выданні размешчаны па тэматычных раздзелах. Пададзены фотаздымкі, біяграфічныя звесткі, бібліяграфічныя спісы, якія адлюстроўваюць жыццё і дзейнасць гістарычных асоб.

Для пошуку інфармацыі выкарыстоўвалі матэрыялы Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці і Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, друкаваныя крыніцы і матэрыялы.

У выніку ў даведнік увайшлі імёны дзеячаў нацыянальна-вызваленчага руху ў горадзе Гродна: Хаіма Александровіча, Аляксандра Бертэля, Веры Валейкі, Міхася Васілька, Абрама Гендлера, Філіпа Пестрака, Сяргея Прытыцкага, Васілісы Селівонік, Валянціна Таўлая, Веры Харужай, Лазара Шайкоўскага.

Сталі вядомыя імёны дзеячаў вызваленчага ваеннага паходу Чырвонай Арміі ў Гродне: Сямёна Багданава, Івана Болдзіна, Канстанціна Увядзенскага, Барыса Герасімовіча, Рыгора Гарнавых, Андрэя Яроменкі, Піліпа Квітка, Міхаіла Кавалёва, Аляксея Куркіна, Міхаіла Пятрова, Максіма Пуркаева, Анатоля Разанава, Леаніда Сандалава, Івана Юшчука.

Таксама ў даведніку прадстаўлены звесткі аб аб'ектах манументальнай памяці Гродна падзей 1939 года: воінскія могілкі (мемарыял на вуліцы Белуша), помнікі на брацкай магіле чырвонаармейцаў, якія загінулі за вызваленне Заходняй Беларусі, на могілках па вуліцы Перамогі, Уладзіміру Катачыну; мемарыяльныя знакі: Аляксандру Бертэлю, Рыгору Гарнавых; мемарыяльныя дошкі дзесяцігоддзю ўз'яднання беларускага народа...

Інэса ІЛЮШЫНА

Натхненне залатой пары

У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адкрылася персанальная выстаўка сучаснага беларускага мастака, члена Беларускага саюза мастакоў Сяргея Пісарэнкі. Праект «Па паверхні вады, па краі восені» запрашае зірнуць на восень вачамі выдатнага творцы. У экспазіцыі прадстаўлены работы, выкананыя ў розных жанрах, але ўсе яны аб'яднаны тоненькімі павуцінкамі залатой пары.

Нягледзячы на пахмурнае неба, пранізлівы дождж і агульную атмасферу апатыі і маркоты, мастакі, літаратары і музыканты ва ўсе часы знаходзілі ў восені асаблівае зачараванне. Гэта пара шчымлівага натхнення для ўсіх творцаў — калі хочацца хаця б на імгненне працягнуць прыгажосць восеньскіх дзянькоў, зафіксаваць яе словам, фотаздымкам альбо мастацкай работай.

Сяргей Пісарэнка не стаў выключэннем і працягнуў своеасаблівую традыцыю ў сваёй творчасці. Мастак працуе ў розных жанрах, натхненне знаходзіць у розных сферах, але яго творчай ментальнасці найбольш блізкія пейзаж і нацюрморт, а любімая тэхніка — акварэль.

«Апошні дзень восені», 2015 г.

Выстаўка «Па паверхні вады, па краі восені» невыпадкова праходзіць у музеі Максіма Багдановіча. Мастацкія работы здаюцца лёгкімі, амаль бязважкімі, але далікатнымі і надзвычай глыбокімі, што вельмі сугучна з паэзіяй знакамітага беларускага аўтара. Дэвізам праекта сталі радкі з верша «Плакала лета, зямлю пакідаючы»:

Кветкі асеннія, родныя, бледныя!
Выраслі вы, каб ураз жа і згінуць.
Можа ж таму душа надарваная —
Гэтак любоўна вянок з вас сплятае…

Сяргей Пісарэнка аддае перавагу акварэлі, аднак у экспазіцыі прадстаўлены алейныя работы майстра, дзе аўтар усё роўна захоўвае акварэльнае бачанне і падыход. Ён паказвае свет нібы праз празрыстую смугу, праз каляровую дымку, якая надае выявам казачнасць і таямнічасць. Чэрпаючы натхненне з навакольля, мастак знаходзіць баланс паміж марай і рэальнасцю.

Вялікую частку прадстаўленых на выстаўцы твораў складаюць пейзажы. Жанр «нацюрморт» адлюстраваны ў работах «Ліпавая гарбата» (2015), «Грушкі» (2013), «Бутля і грушкі» (2021), «Выхадны дзень» (2023). Творы выкананы ў цёплых жоўтых і аранжавых адценнях, быццам мастаку пашчасціла захаваць на сваіх палотнах частку апошніх спякотных сонечных промняў.

Больш маштабна прадстаўлены жанр «пейзаж». Адразу відаць, што гэта сапраўдная стыхія аўтара. На выстаўцы не знойдзеш гарадскіх хмарачосаў і акуратных «прычасаных» паркаў — толькі свабоднае паветра вёскі, лясныя хмызнякі і цішыня. Сяргей Пісарэнка паказвае розную восень. У творах адлюстравана і залатая пара бабінага лета, дзе танюткія павуцінкі кружляюць у вышыні («Восеньскі гай», 2017 г.), і той самы амаль заўважны пачатак восені, калі трава на пожні толькі пачынае жаўцець, а ў паветры з'яўляецца халодны пах блізкага дажджу («Схаваныя дамкі», 2023; «Канюшня», 2018). Апошнія золкія і пахмурныя дні перад першым снегам таксама знайшлі сваё месца на карцінах «Гай» (2017), «Вароны» (2015), «Апошні дзень восені» (2015).

Вёска ў творчасці Сяргея Пісарэнкі паўстае ў сапраўдным яе выглядзе: маленькія драўляныя хаткі, якія месцамі пакрывіліся, аднак не згубілі сваю прывабнасць і нават рамантызм, лясныя масівы, знаёмыя кожнаму вяскоўцу, старэнькія бабулі, якія дажываюць свой век у цішыні і адзіноце. Адным з частых вобразаў у работах мастака з'яўляюцца тыповыя вясковыя жывёлы і іх пажылыя гаспадары. Твор «Апошні дзень восені» лепш за ўсе адлюстроўвае восеньскі настрой у маленькай вёсцы. У жоўта-бурым хмызняку, які раней быў сакавітай маладой травой, спрабуюць знайсці апошніх жучкоў чорныя крумкачы. Голыя, сівыя дрэвы сумна апусцілі свае галінкі. Каля крывой шэрай хаткі сядзіць чорна-белы кот. Пахмурнае неба накрывае гэтую карціну, быццам мяккая коўдра. Хутка пойдзе снег, і пачуццё адзіноты і безнадзейнасці толькі ўзмоцніцца. Нягледзячы на агульны сумны настрой, работа выпраменьвае святло і лёгкасць.

«Восеньскі гай», 2017 г.

Вобразы, якія паўтараюцца ў творчасці Сяргея Пісарэнкі, — пажылая жанчына ў хустцы са сваёй рагатай спадарожніцай — белай казачкай. Спачатку бачым іх пад квітнеючай яблыняй («Квітнеючая яблыня», 2020). Жанчына збірае траву ў кошык, а цяпер прысела адпачыць. З другога боку каза скубе маладую траўку. На карціне «Схаваныя дамкі» (2013) бачым, як гэтыя ж «сяброўкі» вяртаюцца дамоў пад залатым дажджом апалага лісця. Як адзначыў на адкрыцці выстаўкі дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Сяргей Усік, работы мастака напоўнены непаўторным лірызмам, нясуць цеплыню і супакаенне.

Выстаўка «Па паверхні вады, па краі восені» працуе да 10 кастрычніка. Падчас работы экспазіцыі будуць праводзіцца сустрэчы з мастаком і майстар-класы па каліграфіі. Аб правядзенні мерапрыемстваў удакладняйце ў музеі.

Лізавета КРУПЯНЬКОВА

Дарыць свету новыя пачуцці

Самы малады мастак, чые творы знаходзяцца ў калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Ён атрымаў прызнанне на Радзіме і за яе межамі, прадстаўляў беларускае сучаснае мастацтва на міжнародных форумах. Усе гэта пра Захара Кудзіна, чыё жыццё трагічна абарвалася ў 2019 годзе, на самай вяршыне яго творчай кар'еры. Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў запрашае наведаць выстаўку «З'ява», дзе прадстаўлены добра вядомыя і раней не экспанаваныя работы аўтара.

Выстаўка «З'ява» — спроба асэнсаваць феномен творцы, які стаў адметнай фігурай творчай суполкі апошніх дзесяцігоддзяў. Мастак працаваў у кірунку «нейра-арт». Гэты стыль імкнецца аб'ядноўваць часткі і ствараць цэлае. Творы «нейра-арта» падпарадкоўваюць хаос, падштурхоўваюць зазірнуць ва ўнутраны свет і знайсці тую энергію, што загойвае фізічныя і душэўныя раны.

Захар Кудзін апісваў свой мастацкі падыход як «аб'ектыўны рэалізм ці жывапіс уздзеяння». Творца лічыў, што ідэя глабальнай трансфармацыі вызваляе чалавека і самога мастака ад уплыву розных вобразаў, дае магчымасць спыніцца, адпачыць, паглыбіцца ў прастору сваіх думак і ў свет мастацтва. Можна сказаць, што абраны творцам кірунак уздзейнічае на людзей як тэрапія, дзе пануе свабода эмоцый. Па гэтым прынцыпе вельмі лёгка пазнаць работы аўтара сярод іншых. Моцны эмацыянальны пасыл адчуваецца адразу.

Аднак Захара Кудзіна нельга назваць прыхільнікам аднаго стылю. Разнастайныя напрамкі яго дзейнасці прадстаўляюць творы, якія ўжо добра вядомы публіцы, і работы, што не экспанаваліся раней. Выстаўка «З'ява» паказвае творчасць і асобу мастака праз прызму яго асабістых пачуццяў і светапогляду. Дарэчы, прадстаўлены матэрыялы з сямейнага архіва мастака.

У першай зале, куды трапляюць наведвальнікі, можна азнаёміцца з фотаздымкамі Захара Кудзіна і міні-фільмам, матэрыялы для якога былі зняты самім мастаком. Тут жа прадстаўлены твор «Без назвы» (характэрная рыса творчасці Захара Кудзіна ў стылі «нейра-арт») за 2015—2017 гг. У сваіх работах мастак звычайна выкарыстоўваў алей і акрыл.

«Без назвы».

Творца смела эксперыментаваў з формамі і жанрамі. У наступнай зале гледачоў сустракаюць скульптуры Захара Кудзіна, якія паўтараюць формы і колеравую палітру жывапісных работ майстра. Аўтар часта выкарыстоўвае яркія адценні ружовага, аранжавага, жоўтага, блакітнага і зялёнага. Яго работы падобныя на выбух, рознакаляровыя фантасмагорыі, дзе мяккія плаўныя формы перацякаюць адна ў адну, ствараючы чароўны міраж. Творы маштабныя — каб было дзе разгуляцца фантазіі. Многія карціны за 2015—2017 гады нагадваюць той самы «ружовы» свет, дзе існуюць толькі радасць, свабода і бесклапотнасць.

Негледзячы на абраную колеравую палітру, сам Захар Кудзін аддаваў перавагу чорнаму і беламу колерам. Ён называў іх «часткай нашай рэальнасці», што лепш за ўсе перадае сапраўдны настрой мастака і адлюстроўвае свет такім, які ён ёсць. Чорна-белыя работы аўтара сабраны ў асобнай зале. На карціне «Вёска Вялікае Запруддзе» немагчыма ўбачыць вёску — толькі эмоцыі, перададзеныя праз манахромныя зігзагі. Тут няма мяккіх формаў, вострыя лініі падзяляюць прастору, ствараючы ілюзіі, якія зачароўваюць.

У гледачоў ёсць магчымасць паглядзець відэа з сямейнага архіва мастака і фільм Максіма Шведа «Чыстае мастацтва», дзе галоўную ролю выканаў Захар Кудзін. Тыя, хто ўпершыню сустракаюцца з творчасцю маладога творцы, маюць магчымасць пазнаёміцца з яго ўнутраным светам. Захар Кудзін лічыў, што ў мастацтве галоўнае — працэс. Прыгажосць работы раскрываецца падчас стварэння, калі яшчэ сам мастак не ведае, што атрымаецца ў выніку. «Скончаная работа — мёртвая».

«Мастак і мадэль», 2009—2016 гг.

Асобна прадстаўлены творы мастака, набліжаныя да экспрэсіянізму. «Партрэт у чырвоным» (2008—2009), «Аўтапартрэт» (2008—2009) паказваюць яркія стылістычныя эксперыменты. Дапаўняюць іх графічныя творы за 2015—2019 гады. Серыя карцін «Дзяўчына ў транспарце» (2014—2015) адлюстроўвае шматграннасць таленту Захара Кудзіна. Усе тры часткі выкананы ў адзінай колеравай палітры, захоўваючы кампазіцыйныя сродкі. Аднак гэта розныя творы, транслюючы багацце і разнастайнасць поглядаў. Адна і тая ж мадэль — зусім розныя вобразы і пачуцці.

Азнаёміцца з творчай спадчынай Захара Кудзіна можна да 27 кастрычніка.

Лізавета КРУПЯНЬКОВА

Пераемнасць як аснова

Да 29 верасня ў выставачным корпусе Нацыянальнага мастацкага музея будзе працаваць выстаўка «Выяўленчае мастацтва Мардовіі». Праект арганізаваны пры ўдзеле Мардоўскага рэспубліканскага музея выяўленчых мастацтваў імя С. Д. Эрзі і Саюза мастакоў гэтай рэспублікі. Кураторы — Кацярына Запека, старшы навуковы супрацоўнік выставачнага аддзела НММ, і Ганна Кузняцова, старшы навуковы супрацоўнік аддзела замежнага мастацтва музея. Яны паспрыялі таму, каб глядач прасачыў асноўныя тэндэнцыі развіцця мастацтва Мардовіі ў кантэксце пераемнасці пакаленняў і захавання традыцыйных каштоўнасцей.

Агульнае і прыватнае

Выстаўка «Выяўленчае мастацтва Мардовіі» створана з мэтай прадэманстраваць багацце нацыянальных вобразаў і матываў, цесна звязаных з гісторыяй і традыцыямі эрзі і мокшы (гэта дзве этнічныя групы мардвы, блізкія да фінаўгорскіх народаў). Беларускай публіцы прапанавалі 60 твораў жывапісу, графікі,

Вольга Малаева «Дзевяць матываў аб вечным», 2006 г.

Аляксей Курчавы «Вершнік», 2024 г.

скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Аўтары — члены Саюза мастакоў Расіі, якія так ці іначай выказваюць любоў да сваёй Радзімы, прытрымліваюцца прынцыпаў маральнасці і духоўнасці, а яшчэ імкнуцца творча пераасэнсаваць гісторыю і культуру народа.

Удзел у праекце прынялі ў тым ліку вядомыя ў Мардовіі творцы. Сярод іх — заслужаны работнік культуры гэтай рэспублікі Хафіз Бікбаеў. На ўрачыстым адкрыцці выстаўкі ён паведаміў: «Сам я татарын, і нас вельмі шмат у Мардовіі. Я езджу па сёлах, і калі ўдаецца знайсці нейкія рэчы, то рэстаўрырую і калекцынірую іх, а потым выкарыстоўваю ў сваіх нацюрмортах». Яркі прыклад у экспазіцыі — яго «Свет старых рэчаў» (2020).

Старшыня Саюза мастакоў Мардовіі, дырэктар Мардоўскага музея выяўленчых мастацтваў імя С. Д. Эрзі Людміла Нарбекава падкрэслівае, што выстаўка ў беларускім музеі знаёміць з каранямі Мардовіі: «Пераемнасць — гэта аснова асноў любой дзяржавы і народа. І мы, мастакі, апавядаем пра гэта. Кожны расказвае гісторыю сваёй сям'і, таму тут шмат аўтабіяграфічных работ».

На думку спецыяліста, дружба Беларусі і Мардовіі, супрацоўніцтва краін ва ўсіх галінах архіважнае.

Супрацоўніцтва

Праект «Выяўленчае мастацтва Мардовіі» ў Нацыянальным мастацкім музеі можна лічыць чарговым крокам на шляху супрацоўніцтва. Нагадаем: у лістападзе і снежні 2023 года з сучасным беларускім мастацтвам маглі пазнаёміцца жыхары Мардовіі. Тады гледачу прапанавалі графічныя творы (увогуле гэты від выяўленчага мастацтва лічыцца візіткай творцаў Беларусі).

Хафіз Бікбаеў «Свет старых рэчаў», 2020 г.

Дарэчы, генеральны дырэктар НММ Ганна Конанава падрэслівае, што два музеі і два выставачныя праекты аб'ядноўвае любоў да традыцый, увага да нацыянальных асаблівасцей і каларыту. «Падбор твораў быў такі, каб

Людміла Нарбекава «Успаміны дзяцінства», 2018 г.

дзякуючы метадам і падыходам розных мастакоў максімальна раскрыць нацыянальны каларыт краіны. Я думаю, што ў такім сумесным узаемадзеянні гэта ўдалося. Новая выстаўка вельмі сакавітая і па колеравым гучанні, і па традыцыйных падыходах, і па сучасных методыках», — адзначае Ганна Уладзіміраўна.

Між тым падчас адкрыцця выставачнага праекта Беларускі саюз мастакоў было заключана пагадненне аб супрацоўніцтве з Саюзам мастакоў Мардовіі. Дакумент падпісалі Людміла Нарбекава і Наталля Шаранговіч, першы намеснік старшыні БСМ. «У Саюз мастакоў Мардовіі ўваходзіць 89 чалавек. Дастаткова шмат для гэтага краю. У ім многа вельмі розных і вельмі адметных аўтараў, зацікаўленых у супрацоўніцтве з Беларуссю. Так, з'яўляецца магчымасць абменьвацца не толькі выставачнымі праектамі, але і мастакамі, якія маглі б прыязджаць да нас. У сваю чаргу нашы мастакі маглі б прыязджаць у Мардовію», — адзначае Наталля Васільеўна. Яна ўдакладняе, што такога тыпу супрацоўніцтва пачнецца ў наступным годзе з пленэраў.

Яўгенія ШЫЦЬКА,
фота аўтара

Ад Пэна і Рэрыха да Бяшыма Нуралі…

Кажуць, жыццё педагога тады нечага вартае, калі яго ўрокі і досвед увасобіліся ў вучнях, іх жыццях і адкрыццях… У нашага земляка Рувіма Мазеля (1890—1967), які нарадзіўся ў Віцебску, былі яркія настаўнікі. Першасную мастацкую адукацыю атрымаў у Юдэля Пэна. Легендарную віцебскую Школу малявання і жывапісу Рувім Мазель закончыў у 1906 годзе і паступіў у Пецярбургскую школу малявання Таварыства заахвочвання мастакоў…

На пачатку XX стагоддзя выкладчыкамі там працавалі Мікалай Канстанцінавіч Рэрых (1874—1947), які займаў пасаду дырэктара школы, і Аляксандр Бенуа (1870—1960)… Іх урокі, несумненна, шмат далі мастаку-пачаткоўцу, які яшчэ шукаў свой шлях у творчасці…

У 1910 годзе Рувім Мазель вырашыў прадоўжыць вучобу ў Еўропе — паступіў у Мюнхенскую акадэмію мастацтваў у клас гравюры Петэра Хальма. Правучыўся ў Германіі малады чалавек да 1914 года. Канечне ж, маладога творцу цікавілі здзяйсненні мастакоў Адраджэння. Убачыць іх карціны ўжывую — гэта ўжо сама па сабе выдатная школа. Вяртанне ў Расію супала з пачаткам Першай сусветнай вайны… Мастака амаль што адразу прызвалі на службу ў войска. Часць, у якую ён трапіў, перавялі на Поўдзень, у Закаспійскую вобласць. Такім чынам Рувім Мазель апынуўся ў Асхабадзе (так называлася тады сённяшняя сталіца Туркменістана).

І ўжо амаль на цэлае дзесяцігоддзе лёс нашага земляка аказаўся прывязаным да гарачай Каракумскай старонкі. Як толькі прыйшла змена ўлады, разам з А. Владычуком Рувім Маісеевіч пры палітаддзеле Туркестанскага фронту арганізоўвае «Ударную школу мастацтваў Усходу». Да 10 верасня 1920 года фронтам камандаваў Міхаіл Фрунзэ. А следам, да 8 сакавіка 1921-га, — Рыгор Сакольнікаў, затым камандуючым Туркестанскага фронту быў прызначаны беларус Уладзімір Лазарэвіч, легендарная асоба… Магчыма, недзе і сутыкаліся мастакі, якія імкнуліся прыўнесці новую культуру ў мусульманскі свет, і высокія военачальнікі…

Арганізатары школы запрасілі да навучання рускую і туркменскую моладзь. Самым яркім з вучняў аказаўся Бяшым Нуралі (1900—1965). Яму, як і іншым туркменам, было складана пераадолець кансерватыўнае мышленне нацыянальнага асяроддзя. У выпадку з пачаткам творчага лёсу Нуралі мула з яго роднага аула Хазыдарк загадаў пакараць маладога мастака, а ўсе яго працы — знішчыць! З 1923 года Бяшым Нуралі ўжо ўдзельнічае ў мастацкіх выстаўках. А ў 1926—1930 гг. вучыцца жывапісу ў Маскве… Сярод ашхабадскіх вучняў нашага земляка — Вольга Мізгірова, Сяргей Бягляраў, Лізавета Скоблена і іншыя таленавітыя асобы.

«Аўтапартрэт у час малярыі». 1923 г.

У 1925 годзе Ударную школу зачынілі. Прычынай стаў паклёп, які быў адпраўлены на адрас партыйных улад. Праўда, Мазель на той час ужо пераехаў у Маскву. Відаць, што на шчасце… Хаця б сам у такім разе не трапіў пад магчымыя рэпрэсіі ці суровае пакаранне.

З 1930-х да 1950-х гадоў Рувім Маісеевіч удзельнічаў у розных экспедыцыях у Дагестан і Туркменістан. Маштаб творчасці нашага земляка шматбаковы. Некаторы час ён знаходзіўся пад уплывам так званага мюнхенскага мадэрну. Пераехаўшы ў Ашхабад, натхняўся ўсходнімі матывамі. Асноўным рэзультатам творчасці Мазеля ў ашхабадскі перыяд жыцця лічыцца кніга-альбом «Дывановыя казкі». Гэтая работа выканана як «фрэска ў мініяцюры».

«Туркменскі дворык», 1929 г.

Мастак лічыў «Дывановыя казкі» плёнам васьмігадовай творчасці ў Туркменістане… Да 1916—1918 гадоў адносяцца «Узоры персідскага горада» (цыкл акварэляў). У 1922 годзе мастак выканаў серыю малюнкаў «Шахсей — Вахсей». Шахсей-Вахсей, альбо Ашура, — гэта комплекс абрадавых дзеянняў у ісламе. Увага да рэлігійных матываў і далей была ў полі зроку мастака. У 1930-я гады Рувім Мазель стварыў цыкл работ на біблейскія матывы.

1923-м годам датаваны «Аўтапартрэт у час малярыі». Работы ўраджэнца Віцебска і цяпер знаходзяцца ў Дзяржаўным музеі мастацтва народаў Усходу, Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі, Каракалпакскім дзяржаўным музеі мастацтваў імя І. Савіцкага ў Нукусе (Узбекістан). Ды і ў Беларусі таксама — у музеі Марка Шагала ў Віцебску.

Памёр Рувім Мазель у 1967 годзе. Пахаваны ў Маскве на могілках Данскога манастыра.

Мікола БЕРЛЕЖ

Чарговае прачытанне Караткевіча

Не памылюся, калі назаву «Чорны замак Альшанскі» ці не адной з найлепшых кніг Уладзіміра Караткевіча. У ёй ёсць усё, за што і любяць яго творчасць: таямніцы, любоў да свайго краю і беларускай гісторыі, глыбіня і шматслойнасць успрымання сюжэта ў залежнасці ад досведу чытача, рамантычнасць, багатая лексіка, цікавы сюжэт, які інтрыгуе і трымае да фіналу. Менавіта таму дзіўна, што гэты твор экранізаваўся толькі аднойчы: у 80-я гады мінулага стагоддзя сваё прачытанне Караткевіча прапанаваў Міхаіл Пташук, прычым здымкі вяліся не ў Беларусі. Аўтарам сцэнарыя быў сам Уладзімір Сямёнавіч, таму тая стужка была блізкая да сюжэта яго твора. Ніхто доўга (болей за 40 гадоў!) не адважваўся прапанаваць сваю версію знакамітай і любімай многімі пакаленнямі кнігі Караткевіча. І нарэшце мы дачакаліся! Сёлета адбудзецца прэм'ера «Чорнага замка». І гэта вялікі падарунак усім аматарам айчыннага кіно ў год яго векавога юбілею.

— Прэм'ера ў Беларусі і Расіі прызначана на 12 снежня. Мы лічым «Чорны замак» адным з самых доўгачаканых фільмаў 2024 года, — з гонарам падкрэсліў на перадпрэм'ерным паказе стужкі намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Павел Скалабан. — Будзем спадзявацца, што фільм добра прымуць гледачы. Акрамя таго, мы разлічваем на яго ўдзел у розных кінафестывалях, бо работа таго вартая.

Павел Вітальевіч таксама паведаміў, што «Чорны замак» —сумесны праект Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» з расійскай кампаніяй «Нью Арт Сінема Прадакшн». Паколькі рэжысёрам-пастаноўшчыкам з'яўляецца грузін Канстанцін Эсадзэ, гэту работу можна сапраўды назваць міжнароднай.

Гэта не экранізацыя, фільм зняты па матывах кнігі «Чорны замак Альшанскі», таму расійскі рэжысёр-пастаноўшчык Кірыл Кузін параіў прыхільнікам твора глядзець яго стужку як зусім новае кіно. Раней ён наогул не быў знаёмы з творчасцю Уладзіміра Караткевіча, у дзяцінстве бачыў толькі фільм «Дзікае паляванне караля Стаха» паводле аднайменнай кнігі пісьменніка. А вось прадзюсар і аўтар сцэнарыя, наш зямляк Глеб Шпрыгаў, наадварот, чытаў «Чорны замак Альшанскі» болей за 10 разоў. Ён прызнаўся, што з'яўляецца вялікім прыхільнікам гэтага гістарычнага дэтэктыва і таму менавіта да яго прыйшла ідэя стварыць новую версію.

— Караткевіч стварыў шматгранную гісторыю, таму яе вельмі складана экранізаваць — настолькі многа ў ёй часавых пластоў і глыбіні, філасофскага падтэксту, — дзеліцца цяжкасцямі, з якімі яму давялося сутыкнуцца пры стварэнні сцэнарыя, Глеб Шпрыгаў. — Каб змясціць сюжэт у адзін фільм, ад чагосьці прыйшлося адмаўляцца, і гэта было вельмі няпроста! Аднак мне здаецца, што ад агульнай сутнасці рамана мы не адышлі. Хочацца верыць, што ўважлівы глядач убачыць і ацэніць тую павагу, з якой мы ставіліся да кнігі і творчасці Караткевіча, ствараючы гэтае кіно.

Глеба Шпрыгава можна назваць рызыкоўным чалавекам, бо ён дазволіў сабе перапісаць класіка. Падзеі кнігі перанесены з 70-х гадоў мінулага стагоддзя ў наш час. Галоўны герой Косміч значна памаладзеў. Гэта сучасны хлопец, які паспявае і круціць раманы, і кіраваць сваім антыкварным магазінам, і нават лекцыі ў Нацыянальнай бібліятэцы чытаць. Ён уражвае ведамі гісторыі Беларусі ў такім маладым ўзросце і сваёй спартыўнай

Фота БелТА.

формай (далей без падрабязнасцей, каб не было спойлераў). А можа, гэта і добра, каб у маладога пакалення з'явіўся новы герой — харызматычны, разумны, мужны, гэтакая мешаніна Індыяна Джонса і прафесара Лэнгдана.

Як растлумачыў рэжысёр Кірыл Кузін, фільм створаны з прыцэлам на кінапракат, таму стужка звярнула ў забаўляльны бок, а і яе галоўны герой такога ўзросту, каб чапляць асноўную кінааўдыторыю. Канечне, гэта зусім не значыць, што людзям у больш сталым узросце глядзець фільм будзе нецікава. Кожны знойдзе ў ім нешта сваё. Напрыклад, аўтар гэтых радкоў у час перадпрэм'ернага прагляду атрымлівала асалоду ад аператарскай працы — у фільме наша краіна паказана з вялікай любоўю. Лакацыі, у якіх пабывала здымачная група, сапраўды ўражваюць — настолькі вялікая геаграфія і прыгожыя краявіды. Тыя, хто шмат вандруе, з лёгкасцю пазнаюць любімыя вуліцы і знакамітыя беларускія славутасці, кавалачкі маршрутаў для пешаходных прагулак. Спецыяльна не стану называць гэтыя месцы, каб не ўплываць на ўражанне гледача ад фільма. Будзьце гатовыя да сюрпрызаў, бо часам героі ўваходзілі ў будынак у адным рэгіёне Беларусі, а выходзілі ў іншым.

— Раней я не ведаў, што ў Беларусі настолькі вялікі турыстычны патэнцыял, — прызнаўся рэжысёр. — Падчас вандроўкі па ўсёй краіне і выбару цудоўных лакацый быў прыемна здзіўлены харастваом мясцін, дзе запланавалі здымаць фільм. Калі вы добра знаёмыя з беларускай архітэктурай, то будзеце здзіўляцца, таму што мы заходзім у аб'ект у Мінску, узнімаемся па ім у Гродне, а выпадаем з яго ў Віцебскім раёне. Мова кнігі, вядома, адрозніваецца ад мовы кіно — працавалі па законах драматургіі і стваралі стужку для сучаснага гледача, які праз 20 хвілін можа захацець паглядзець у свой тэлефон. Але зрабілі ўсё магчымае, каб ён не адарваўся ад кінаэкрана.

Мяркую, аматарам Караткевіча будзе цікава даведацца, як кіношнікам удалося стварыць інтэр'еры замка ў павільёнах «Беларусьфільма». Вялікая ўдача, што, як і ў фільме «Чорны замак Альшанскі», аўтарам сучаснага фільма ўдалося сумясціць на экране дзве рэальнасці (паралельна падзеі адбываюцца і ў XVII стагоддзі). Аматары гісторыі змогуць ацаніць прыгожыя гістарычныя касцюмы, сцэны бою, скачкі. Мастак-пастаноўшчык Наталля Наваенка адзначыла, наколькі няпроста і адначасова цікава было ствараць гістарычную частку карціны, бо ўсё, акрамя палёў, лясоў і рэк, рабілася рукамі дэкаратараў і мастакоў, а гэта тытанічная праца.

— Я наогул люблю здымацца ў гістарычным кіно, таму што адпаведныя падзеі і гістарычныя касцюмы дапамагаюць пражываць ролю, — дзеліцца ўражаннямі ад здымак у «Чорным замку» народны артыст Расіі Віктар Вяржбіцкі. — У фільме задзейнічаны акцёры розных кінашкол і тэатраў, але мы ўсе здолелі стаць адзіным ансамблем, таму што вельмі паглыбіліся ў эпоху. Хвалююся, што скажа глядач, але, паверце, уся здымачная група паставілася да гэтай работы з вялікай адказнасцю. Канечне, мне як артысту маёй ролі не хапіла, бо заўжды хочацца раскрыць героя яшчэ больш. Але мне сапраўды было цікава ўжывацца ў свой вобраз.

Віктар Вяржбіцкі прызнаўся, што ў кіно працаваць складаней, бо ў тэатры можна нешта перарабіць у іншым спектаклі, з часам палепшыць сваё майстэрства дзякуючы рэпетыцыям, а ў кадры менш часу.

— Вельмі адказна працаваць, калі кіно здымаецца па любімай кнізе вялікай колькасці людзей. Зразумела, мы шчыльна працавалі з аўтарам сцэнарыя. Ён расказваў нам пра гістарычныя мясціны і важныя моманты ў творы. У мяне былі эпізоды ў выдатным Мірскім замку! Гэта такі цікавы досвед, — згадаў прыемныя моманты артыст.

Акцёрская ігра сапраўды ўражвае! Персанажам верыш, ніхто не выпадаў з гістарычнага кантэксту, нават у эпізадычных ролях зняліся вядомыя акцёры, якія ўпрыгожылі фільм, напрыклад, Руслан Чарнецкі. Магчыма, хтосьці прадстаўляў іншымі Стасю Рэчыц ці Лыганоўскага, але гэта ўжо рэч суб'ектыўная. На маё пытанне наконт кастынгу на галоўныя ролі рэжысёр адказаў так:

— Амаль усе акцёры праходзілі пробы, нават Яўген Стычкін. Толькі Віктара Вяржбіцкага спецыяльна запрасілі на ролю Станкевіча. Было некалькі кандыдатур на ролі Стасі Рэчыц і Гардзіславы, але агучваць іх імёны будзе неэтычна. Тым, як артысты справіліся са сваімі ролямі, я застаўся задаволены. Вядома, трукі выконвалі каскадзёры, але некаторым акцёрам усё роўна ў шэрагу сцэн давялося выйсці за грані сваіх магчымасцей, напрыклад, авалодаць майстэрствам скачак. Хтосьці наогул выконваў некалькі роляў, пераўвасобіўшыся адразу ў некалькіх персанажаў.

Наталля СЦЕЖКА, кандыдат мастацтвазнаўства:

— Упершыню «Чорны замак Альшанскі» быў зняты ў 80-я гады мінулага стагоддзя, калі яшчэ адчувалася магутнае рэха вайны, таму там быў зусім іншы кантэкст. Бліскучая работа выдатнага беларускага рэжысёра Пташука! Аднак сучаснаму гледачу той фільм можа быць ужо не такі зразумелы. Хачу пахваліць Глеба Шпрыгава, які стварыў сцэнарый для новага твора. Звярніце ўвагу, як выпісаны новы вобраз Косміча — ён не проста вучоны, гэта новы секс-сімвал, ён стыльны, сучасны, таму вельмі трапляе ў мэтавую аўдыторыю. Так, фільм па матывах Караткевіча — і гэта лічу абсалютна правільным. Чым прываблівае класіка? Кожнае пакаленне ўбачыць у ёй нешта сваё. У «Чорным замку» Караткевіча перачыталі па-свойму, і прыхільнікам рамана не трэба злавацца на гэта. Я пераканана, што стужка знойдзе свайго гледача. Уся здымачная група размаўляе на адной зразумелай мове, відаць, што гэтая гісторыя ў жанры гістарычнага дэтэктыва ўсіх зачапіла. У фільме выказваецца вялікая любоў да Беларусі. Якія там прыгожыя панарамы! Мне не надта спадабаліся містычныя рысы аднаго з герояў, але гэта мае месца, калі рэжысёр так бачыць. У астатнім гэта цудоўнае кіно! Яно створана з душой і павагай да нашай гісторыі. У фільме звычайна адчуваецца галоўная ідэя, і тут яна такая: народ, які не памятае сваёй гісторыі, не мае будучыні. Паглядзеўшы «Чорны замак», падумалася: а можа, у нас будзе яшчэ працяг — «Дзікае паляванне караля Стаха», «Хрыстос прывямліўся ў Гародні, «Каласы пад сярпом тваім»? Караткевіч настолькі шматгранны, што пра гэта варта падумаць рэжысёрам. Я вельмі задаволена фільмам і запрашаю ўсіх прыйсці на прэм'еру. А пакуль да яе ёсць час, магчыма, хтосьці захоча перачытаць кнігі Караткевіча. Ужо гэтым новыя фільмы карысныя!

Ірына ПРЫМАК

☑ У фільме «Чорны замак» — сузор'е расійскіх і беларускіх акцёраў: Віктар Вяржбіцкі (Станкевіч), Віталь Кішчанка (князь Вітаўт Альшанскі/Альшанскі), Яўген Шварц (Антон Косміч/Валюжыніч), Яўген Стычкін (Лыганоўскі), Лінда Лапіньш (Алена), Анастасія Красоўская (Гардзіслава), Вераніка Усцімава (Стася Рэчыц), Сяргей Беляковіч (Жыховіч), Павел Камароў (Мар'ян), Аляксандр Душачкін (Лапатуха), Аляксандр Гіронак (Клепча).

На перадпрэм'ерным паказе стужка ішла больш за дзве гадзіны (рэжысёрская версія — наогул тры гадзіны!), але ў пракат фільм хутчэй за ўсё выйдзе са скарочаным хронаметражом — 1 гадзіна 53 хвіліны. Гэта будзе зроблена для гледача, каб фільм стаў яшчэ больш дынамічным.

Кніга «Чорны замак Альшанскі» — гістарычны дэтэктыў. Што датычыцца новага фільма, то яго рэжысёр Кірыл Кузін лічыць: сучаснае кіно нельга здымаць у адным жанры, у ім павінна быць усё. Таму «Чорны замак» хоць і назвалі прыгодніцкай стужкай, у ёй можна знайсці нават містычныя ноткі.

Пра што «Чорны замак»? У антыкварны магазін Косміча і яго партнёра Пташынскага трапляе старое Евангелле, якое належала роду Альшанскіх. Такім чынам сябры знаходзяць шыфр, які хаваецца ў тэксце. Неўзабаве Пташынскі забіты, пад падазрэннем — Косміч. Яму ўдаецца збегчы, каб разгадаць усе таямніцы і знайсці сапраўднага забойцу. У гэтым Космічу дапамагае студэнтка Стася Рэчыц — ураджэнка Альшан. Паралельна падзеі адбываюцца ў мінулым…

Калі хто спытае: «Дзе размешчана Гургуртэпа?», адразу зразумела, што гэта госць, які нядаўна прыехаў у Ташкент. Гургуртэпа знаходзіцца ўнізе Бадамзара, збоку Шыўлі і Дарханарыка, у прыватнасці на верхнім баку Акурганскага арыка. У даўнія часіны Гургуртэпа ўся была засаджана зялёнымі садамі (ва ўсялякіх разе, пра гэта сведчыць і тое, што напрыканцы 50-х гадоў мінулага стагоддзя яе далучылі да горада).

Старыя, якія жывуць у Гургуртэпе, гавораць, што раней тут і ў сараган веяў прыемны ветрык, таму гэтыя мясціны называліся Гіргіртэпа, але з часам назва пераўтварылася ў Гургуртэпэ. А некаторыя запэўніваюць, што тут сяліліся палявыя галубкі, і ад іх спеваў «гур-гур» і пайшла гэтая назва. Пачуўшы гэта, аксакалы махалі пакрыўджаным тонам кажуць: «У Гургуртэпе жылі салаўі, майнушкі, галубкі пясчаныя. У дварах пяшчотна спявалі галубкі, а ў небе танцавалі галубы. Але ў гэтых мясцінах ніколі не было палявых галубак!»

Цяпер Гургуртэпа знакамітая ў Ташкенце пад іншай назвай. У любым кутку горада, калі спыніць таксі і скажаць: «У казы-махалю», таксіст прывязе вас прама ў Гургуртэпу. Таму што тут жывуць самыя ўмелыя майстры — вытворцы казы. Выключныя фразы, уласцівыя дыялекту сталіцы, асабліва прыгожа гучаць у гэтай махале. А жанчыны, якія жывуць тут, з вялікім задавальненнем абмяркоўваюць навіны і ўсялякія плёткі.

У Гургуртэпе нарадзіліся знакаміты архітэктар Ташкента, выдатны ўзбекскі спартсмен, артыст музычнага тэатра, паэт-песеннік, творы якога некалі пастаянна гучалі па радыё і на тэлебачанні, а таксама шэраг мясцовых прадпрымальнікаў. Гэта месца валодае многімі станоўчымі якасцямі, і невыпадкова знакаміты ўзбекскі пісьменнік аддаў перавагу гэтай махалі, пераехаў сюды з гістарычнай мясціны, яка Карнак.

Гургуртэпа таксама вядомая сваімі нябачанымі і нечуванымі гісторыямі. Падзеі, якія адбыліся ў адно лета, сталі тэмай для многіх расповедаў. Я іх сабрала і аб'яднала разам. Паверце, гэтыя падзеі сапраўды адбываліся. Атрымаўся паўнавартасны партрэт Гургуртэпы і яе жыхароў.

На крайні выпадак, калі прыедзеце ў Гургуртэпу, запытайцеся ў мясцовых жыхароў, ці жывуць тут дзядуля Сіджо, цётачка Джаміля, Гафур ака і Турсун ака, і вы атрымаеце станоўчы адказ. Пасля ваш суразмоўца дадасць: «Вы жадаеце купіць казы? У нашай махалі гатуюць казы выдатнай якасці, так што няма неабходнасці шукаць менавіта дзядулю Сіджо, і з намі можаце дамовіцца».

Рысалат ХАЙДАРАВА

Рысалат ХАЙДАРАВА
(Узбекістан)

Гарачае лета ў Гургуртэпе

Урывак з аповесці

Жаніх

Насамрэч, у гэтага хлопца ёсць прыгожае імя. Фатхула. Але яго імя, пераходзячы з адных вуснаў у другія, перайначылася і пачало гучаць іначай — Патхіла. Некаторыя з сяброў звалі яго коратка — Пакі. Пасля, калі мексіканскі серыял, які паказвалі па тэлебачанні, атрымаў шырокую вядомасць, Патхіла-Пакі пераўтварыўся ў Педра. Таму што людзі Гургуртэпы вырашылі, што Пакі вельмі падобны на Педра.

Сапраўды, гэты хлопец быў вельмі падобны на мексіканскага акцёра: смуглявы, худзенькі, пранырлівы, заўсёды апрануты ў белую футболку з кароткімі рукавамі і белую кепку, у лёгкіх скураных шлёпанцах імклівай паходкай праходзіў па вулачках махалі. Яшчэ адна станоўчая якасць Педра была ў тым, што ў яго рукі залатыя. Усе хлопцы Гургуртэпы, якія мелі ўласны аўтамабіль, сябруюць з Педра. Таму зусім не істотна, патрэбна ім дапамога Педра ці не, яны штодня завітваюць да яго ў майстэрню проста прывітацца.

Някідкая майстэрня размешчана на пачатку махалі, побач з ёю ўсталяваны паказальнік са словамі: «Рамонт рухавіка, аднаўленне карбюратара, балансіроўка, вулканізацыя». Каля прыгожага паказальніка заўжды стаіць нямала машын. Пад старым абрыкосавым дрэвам, якое расце каля майстэрні, усталяваны няўклюдны стол і крэслы, на якіх сядзяць і весела гутараць маладыя людзі.

Непадалёку ад хлопцаў, на абочыне дарогі, на маленькім зэдліку сядзіць адзін з мясцовых прадпрымальнікаў і гандлюе раскладзенымі на скрыні цыгарэтамі, запалкамі і гумаўкай. Каля яго вялікае эмаліраванае, накрытае марляй, вядро. А побач з вядром кавалак кардону, на якім напісана: «Фруктовы сок». Гандаль у прадпрымальніка не сціхае, і ён пра сябе моліцца за Педра. Канечне, калі б не было Педра, то і не прыехала б гэтулькі людзей у гэта непрыкметнае месца.

Педра добра абыходзіцца з усімі, хто завітвае да яго ў майстэрню. Але толькі аднаму з наведвальнікаў — Кудрату двойчы ў дзень перадае прывітанне. Кудрат — малодшы сын Даўлат ака, які з'яўляецца адным з самых паважаных вытворцаў казы. Яго бацьку — дзеда Сіраджыддзіна жыхары Гургуртэпа называюць дзядуля Сіджо. Ён вядомы тым, што з'яўляецца нашчадкам старадаўніх вытворцаў казы, а таксама сваімі выкрыкамі і посахам.

А прывітанні Педра перадае праз Чарас, васямнаццацігадовую малодшую сястру Кудрата. Кожную раніцу, калі Чарас, раздзімаючы падол жоўтай, зялёнай ці ружовай сукенкі, накіроўваецца на працу ў паліклініку, размешчаную ў пачатку махалі, Педра адчыняе дзверы сваёй майстэрні і кладзе цагліны пад створкі, каб яны не зачыняліся. Дзяўчына ветліва вітаецца з ім.

— Ваалайкум салам, — адказвае на яе прывітанне Педра, у гэты час вочы яго гараць агнём. — Як справы, Чарас?

— Дзякуй, добра, — гаворыць яна, замаруджваючы тэмп хады.

— Кудрат пайшоў на працу?

— Чарас сцвярджальна ківае галавою.

— Добра, перадай брату прывітанне ад мяне.

— Добра.

Дзяўчына мінае майстэрню. Малады чалавек краем вока сочыць за ёю.

Вечарам, калі Чарас вяртаецца дадому, майстэрня бывае перапоўненай людзьмі, а Педра сядзіць за абаранкам адрамантаванай машыны ці стаіць перад адкрытым капотам і нешта тлумачыць гаспадару аўтамабіля. Дзяўчына вітаецца.

— Ваалайкум салам, — спакойна адказвае Педра.

Чалавек, які стаіць побач з ім, таксама вітаецца ці ківае галавою.

— Кудрат працуе? — пытаецца Педра.

— Працуе, — не спыняючыся, адказвае дзяўчына і прадаўжае ісці, скіраваўшы позірк долу.

— Добра, перадай прывітанне свайму брату!

— Ладна.

Педра, не пазіраючы ў бок дзяўчыны, прадаўжае размову з мужчынам, які стаіць побач. Чарас непрыкметна, з-пад зямлі кідае позірк на маладога чалавека.

Калі колькасць перададзеных прывітанняў пераўзыйшла сотню, Педра нарэшце асмеліўся сказаць і іншыя словы.

У той дзень малады чалавек з самай раніцы адчыніў сваю майстэрню і, быццам збіраючыся да выканання найважнейшай справы, рашуча стаяў на абочыне дарогі. Вось на дарозе паказалася Чарас, размахваючы падолам сукенкі бурштынавага колеру. Убачыўшы, што на ўскрайку дарогі стаіць Педра і глядзіць на яе, яна сабрала рассыпаныя на лобе валасы. Падышоўшы бліжэй, яна прывіталася як звычайна. Чамусьці Педра не адказаў ёй. Здзівіўшыся, Чарас прыўзняла вочы. Малады чалавек падціснуў вусны і рашуча глядзеў на яе. Вейкі дзяўчыны запытальна мільгацелі.

— Чарас, я кахаю цябе, — сказаў малады чалавек.

Смуглявы твар дзяўчыны пачырванеў.

— Я ведаю… — ціха адказала яна.

Вочы Педра сталі круглымі ад здзіўлення:

— Адкуль?

Чарас усміхнулася:

— Я таксама чалавек, вось і заўважыла…

Пасля гэтых слоў малады чалавек зрабіўся яшчэ болей упэўнены:

— Чарас, я ажанюся з табой!

Дзяўчына прыжмурылася:

— Што, зараз!

— А што? Адзін мула, адна галоўка цукру і грошы — тры сумы…

— Кіньце! «Адна галоўка цукру»! Паспрабуйце спярша ўгаварыць майго дзядулю!

— Я яго ўгавару!

— Не, не зможаце яго ўгаварыць, — дрыготкім голасам сказала дзяўчына. — Мой дзед вельмі ўпарты чалавек.

У гэты момант на пачатку вуліцы з'явілася нейкая машына. Чарас спужана зірнула ў той бок. Педра хуценька адступіў і саступіў дзяўчыне дарогу.

— Мая мама сёння прыйдзе да вас, — таропка сказаў ён наўздагон.

Вечарам сціплая маці Педра ціхенька ўваходзіла ў велізарны дом Даўлата ака. Маці Чарас была жанчынай, якая добра ведае ўзбекскую прымаўку: «Дом, дзе дачка ўжо нявеста, быццам караван-хлеў». Таму яна прыязна сустрэла сваю суседку. Запрасіла яе ў прыгожую залу, заслала абрус, выставіла розныя пачастункі. Па звычаі, сваццяпачала хваліць Чарас:

— Чарасхан разумная, разважлівая дзяўчына. Рука ў яе лёгкая. Усе хворыя жадаюць, каб укол ім рабіла Чарас…

Згодна са звычаем, маці дзяўчыны сціпла ўсміхнулася:

— Кожнай сям'і патрэбен доктар, на крайні выпадак медсястра… Бацька. Чарас таксама так думае, таму адправіў яе вучыцца ў «Бароўскага»…

У гэты момант з двара пачуўся сярдзіты голас дзядулі Сіджо:

— Хто гэтая жанчына?

Унучатая нявестка спуджана адказала:

— Гэта жонка дзядзькі Рахматылы… Прыйшла сватаць Чарасхан за Педра…

— За каго?

— Ну-у… за таго хлопца, які рамантуе машыны…

Хутка на парозе з'явіліся жанчыны. На дзядулі Сіджо быў белы якатак, галаву ўпрыгожвала цёмна-зялёная цюбецейка, на вачах — акуляры з тоўстымі шкельцамі. Ён стаяў пасярод двара, моцна трымаючы ў руцэ свой посах. Маці Педра, прыкладаючы руку да грудзей, прывітала старога.

— Ваалайкум салам, — насупіўся стары. — Як пажывае Рахматыла?

— Дзякуй, дзядуля Сіджо, у яго ўсё добра.

— Усё яшчэ круціць абаранак аўтобуса?

— Так…

Стары болей нічога не сказаў. Апусціўся на крэсла, пастаўленае каля базіліка, і заплюшчыў вочы. Маці дзяўчыны правяла сваццю да варот.

На наступны дзень Педра ізноў з самай раніцы адкрыў сваю майстэрню і чакаў на абочыне дарогі. Хутка паказалася Чарас. Убачыўшы маладога чалавека, яна пачырванела, пасля прыкусіла губу.

— Чарас, як справы? — запытаўся Педра, стараючыся не паказваць свае ўнутраныя дрыжыкі.

Раптам вочы дзяўчыны напоўніліся слязьмі:

— Я ж казала, што мой дзядуля вельмі ўпарты чалавек!

— Дзядуля… Што, ён не пагадзіўся?

— Дзядуля… крычаў… Ён сказаў, што аддасць сваю ўнучку ў багатую сям'ю… — Чарас адвярнулася, пасля дрыготкім голасам сказала: — Дзядуля жадае аддаць мяне замуж за такога чалавека, у якога грошы не ўлазяць у машыну…

Сэрца хлопца ёкнула. Праз некаторы час ён запытаўся з непрыхаванай надзеяй:

— А што сказаў твой бацька?

— Бацька… нічога не сказаў.

— А маці?

— Мама… яна таксама маўчала.

— А твой брат?

— Мой брат заступіўся за вас! «Педра — добры хлопец», — сказаў ён. Але дзядуля насварыўся на майго брата… «Ён табе дапамагае, таму і гаворыш, што ён добры!», — крычаў дзядуля…

— Але калі Кудрат заступіцца за мяне, тады справы не зусім дрэнныя, — прашаптаў хлопец, пасля задумаўся.

У канцы вуліцы паказаўся чалавек, які хутка набліжаўся.

— Чарас, нехта ідзе сюды. Ладна, ты ідзі…

Дзяўчына раскрытымі вачыма паглядзела на хлопца. Малады чалавек адказаў ёй сумным позіркам.

Бліжэй да абеда Кудрат зайшоў у майстэрню. Павітаўся з усімі, пагаварыў пра розную драбязу. Калі ў майстэрні засталіся яны адны з Педра, ён прамармытаў, быццам просячы прабачэння:

— Дружа, не адчайвайся, ты ж ведаеш майго дзядулю…

Педра кінуў у кут жалязяку, якую трымаў у руцэ, і падняўся:

— Кудрат, ты ж працаваў у Народным банку?

Кудрат здзівіўся:

— І цяпер працую там. А што здарылася?

— Ты мяне назваў «дружа», і насамрэч так да мяне адносішся? Ці толькі таму, што я табе дапамагаю? Толькі адкажы па праўдзе!

— Я і сапраўды так думаю. Калі я цябе падманваў?

— Тады ты павінен мне дапамагчы!

— Ну, калі змагу, канечне, дапамагу! А што зрабіць трэба?

…Бліжэй да вечара Даўлат ака выйшаў са сваёй крамы і па нейкай справе пайшоў дадому. Раптам ён убачыў аўтамабіль «Ціко», прыпаркаваны ля варот яго дома. Ён уважліва агледзеў машыну.

«Ціко» належала Мураджану, гандляру прадуктовай крамы, размешчанай каля шашы. Да «Ціко» была прычэплена аўтакаляска. Звычайна ў гэтай каламажцы Мураджан прывозіў хлеб, таму яе зверху накрылі баваўнянай шэрай тканінай, а краі тканіны моцна завязалі. Мураджан сядзеў за рулём, а Педра — побач з ім.

Убачыўшы Даўлата ака, Педра выскачыў з машыны. Склаўшы рукі на грудзях, ветліва прывітаўся з ім. Мураджан таксама прывітаў старога і стаў побач з сябрам.

— Ну, маладыя людзі, раскажыце, у чым справа? — запытаўся Даўлат ака, гледзячы то на Педра, то на Мураджана.

— Дзядзька… — пачаў гаварыць Педра, стоячы смірна, быццам збіраўся выслухаць прысуд. — Я прынёс тое, што прасіў дзядуля Сіджо!

— Та-ак?! — Даўлат ака паглядзеў на хлопцаў, пасля на машыну. — І пра што прасіў мой бацька?

— Учора ён сказаў, што аддасць унучку таму чалавеку, у якога грошы не змесцяцца ў машыну… Вось, я прынёс!

Па жэсту Педра Мураджон падняў шэрую тканіну. Аўтакаляска была набіта манетамі!

Даўлат ака сумеўся. Ён абышоў каляску, агледзеў яе з усіх бакоў. Пасля нечакана рассмяяўся.

— Ты… ты разумны хлопец! — усклікнуў ён, выціраючы далонямі слёзы на вачах. — Патхула, ну ты даеш! Малайчына, Педра! Ты сапраўдны жыхар Гургуртэпы! Аказваецца, Кудрат праўду наконт цябе казаў!

Даўлат ака некалькі мінут з непадробнай цікаўнасцю пазіраў на манеты. Пасля ён зрабіўся сур'ёзным.

— Скажы Рахматыле, няхай прыйдзе ў маю краму, толькі крышку пазней, ладна? — сказаў ён.

…Праз два дні ў Гургуртэпе распаўсюдзіліся чуткі:

— Даўлат ака аддае сваю дачку замуж за Педра…

— Скажыце ж, што за цуд? Сын Рахматылы ака — Педра жэніцца з нашай Чарас!

* * *

— А грошай у яго колькі было?

Мой бацька няспешна прысёрбваў зялёны чай, пасля лёгка махнуў рукою.

— Адкуль я ведаю? — сказаў ён. — Колькі хлеба месціцца ў гэтую каляску, відаць, і манет гэтулькі ж… Сума, якой хопіць, каб аплаціць музыкантаў ці купіць барана, а можа хопіць і для прыгатавання вясельнага плову!

— Ой-ёй… Што робіцца на белым свеце, а? Якое ж вяселле на гэтыя грошы, — бацька працягнуў мне піялушку, пасля павярнуўся да мамы і насупіўся: — Ты жывеш у Гургуртэпе! І сын Рахматылы таксама з Гургуртэпы! Усё, перастань войкаць!

З узбекскай.
Пераклад Алеся КАРЛЮКЕВІЧА
Працяг будзе

Горад жыве

Да 29 верасня ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага можна ўбачыць выстаўку твораў Уладзіміра Жбанава (1954–2012). «Гарадскі летапіс у бронзе» — такую назву мае экспазіцыя, прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння знакамітага майстра гарадской і паркавай скульптуры.

Уладзімір Жбанаў.

Што гэтым разам прапануюць аматару творчасці майстра? Работы са збору сям'і мастака і фондавых калекцый розных музеяў. У стварэнні выстаўкі паўдзельнічалі Нацыянальны мастацкі музей, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Беларускі саюз мастакоў і, натуральна, Музей гісторыі горада Мінска, у структуру якога ўваходзіць галерэя Савіцкага.

У новай экспазіцыі дэманструюцца мадэлі шматлікіх гарадскіх скульптур і творы станковага мастацтва. Многія з іх вядомыя мінчанам і гасцям сталіцы — майстар стварыў для яе шмат работ за даволі кароткі перыяд. Прайшло каля дзесяцігоддзя, і «Незнаёмка» (1998), «Той, хто прыкурвае» (1999), «Дзяўчынка з парасонам» (2000), «Дама з сабачкам» (2001), «Фатограф» (2001), «Баншчык» (2004), «Дойлід» (2006) і многія іншыя героі стала «прапісаліся» на вуліцах і плошчах Мінска. Між тым работы Уладзіміра Жбанава сталі часткай прасторы не толькі гэтага горада — скульптуры майстра ўпрыгожваюць розныя куточкі Магілёва, Бабруйска, Маладзечна, Ліды, Светлагорска… Яго творы можна знайсці і ў расійскіх гарадах (Хімкі, Даўгапрудны, Табольск, Курск), ва ўкраінскім Паўлаградзе. З гэтымі творамі, а таксама працэсам працы над імі дазваляюць пазнаёміцца фатаграфіі і відэафільмы, прадстаўленыя на выстаўцы «Гарадскі летапіс у бронзе».

Скульптуры майстра сталі часткай жыцця старажытнага Мінска. Яго работы, па-першае, не адрозніваюцца статычнасцю — многія персанажы быццам фіксаваліся падчас руху, а не пазіравання. Па-другое, кожны яго герой запрашае да блізкага знаёмства. Вопытны скульптар, натуральна, прадугледжваў, што гараджане, юныя і дарослыя, якія любяць дакранацца да скульптур, фатаграфавацца побач з імі, калі гэта магчыма — вітацца, абдымаць, сядзець побач, будуць імкнуцца да своеасаблівага сяброўскага ўзаемадзеяння, і ўлічыў гэта. Невыпадковая кожная характарыстыка кампазіцый, як і нездарма выбраны месцы для іх размяшчэння. Аднак, у рэшце рэшт, галоўныя ролі іграюць самі героі, часта сведкі іншых эпох, народжаныя для таго, каб стварыць у горадзе асаблівую атмасферу, паўплываць на яго аблічча.

А жыццё твора мастацтва — тэма для асобнай гутаркі аб гарадской скульптуры. Найперш гэта звязана з чуткамі і легендамі пра тое, хто быў прататыпам таго ці іншага героя, як склаўся лёс чалавека, які пазіраваў для мастака. У выпадку з творчасцю Уладзіміра Жбанава звестак засталося даволі шмат. А як узнікаюць масавыя забабоны аб тым, што на ўдачу трэба пацерці пэўны фрагмент скульптуры і загадаць жаданне, — гэта ўжо загадка!

Пры жыцці Уладзіміра Жбанава не адбылося ніводнай яго персанальнай выстаўкі. Вядома, што майстар адкладаў гэтую падзею да свайго 60-годдзя. Ажыццявіць задуманае не паспеў… Сённяшні ж праект — ужо падарунак жыхарам сталіцы да дня яе нараджэння. Многія згодны з тым, што, дзякуючы менавіта намаганням Уладзіміра Іванавіча, скульптура Мінска, а таксама іншых гарадоў, для якія аўтар ствараў свае работы, перастала выяўляць маштабныя ідэі, пазбавілася ідэалагічнай нагрузкі і афіцыёзнасці. Болей жыцця, святла і лёгкасці — нібы дэвіз майстра, якога ведалі і помняць шматлікія ўдзячныя гледачы.

«Чаканне», 2011 г.

Яўгенія ШЫЦЬКА,
фота Кастуся ДРОБАВА

зваротная сувязь

Класіка ў нефармаце

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя перадачы.

У выхадныя — праект Навума Гальпяровіча «Сучаснікі. Літаратурныя партрэты». Героем расповеду стане Хведар Чэрня. У чацвер — публіцыстычная перадача Настассі Ермалюк «Свет мастацкага слова».

Радыёверсію тэлеперадачы «Суразмоўцы» Навума Гальпяровіча можна паслухаць у нядзелю і панядзелак. Гэтым разам сустрэча з пісьменніцай і журналісткай з Віцебска Святланай Дзядзінкінай.

Па буднях у праграме «Літаратурная анталогія» — раман «Знесеныя ветрам» Маргарэт Мітчэл. У «Радыёбібліятэцы» з панядзелка да пятніцы — аповесць «Крэйцэрава саната» Льва Талстога (чытае Уладзімір Рагаўцоў).

У праграме «Прачулым радком» у выхадныя — вершы Уладзіміра Жылкі (чытае Алег Вінярскі).

«Літаратурныя гісторыі» пазнаёмяць з апавяданнямі айчынных і замежных аўтараў.

У перадачы «Радыётэатр плюс» (пачатак эфіру ў 21.30) у суботу і нядзелю прагучыць спектакль «Незамужняя ўдава» паводле п'есы Мікалая Матукоўскага.

Для юных прыхільнікаў мастацкага слова — праект «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» — «Сонечная паляна» Валерыя Гапеева. Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для самых маленькіх.

Праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і зместам новага нумара «ЛіМа».

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

22 верасня — на Фестываль духоўнай творчасці, які пройдзе ў музеі-запаведніку «Нясвіж». Пачатак у 10.00.

23 верасня — у публічную бібліятэку № 6 (вул. А. Кашавога, 10) на творчую сустрэчу з Уладзімірам Мазго. Пачатак у 11.00.

24 верасня — у бібліятэку № 5 (вул. Казлова, 2) на сустрэчу клуба МГА СПБ «Азарэнне», заснаванага пры дзяржаўнай установе «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Савецкага раёна г. Мінска» — у пазнавальную вандроўку «Няхай падарожжы дораць натхненне». Пачатак у 17.30.

25 верасня — у Мемарыяльную залу Дома літаратара (вул. Фрунзэ, 5) на сустрэчу з членам СП Расіі Анатолем Амельчуком (г. Цюмень). Пачатак у 11.00.

25 верасня — у літаратурны клуб «Шчырасць» пры публічнай бібліятэцы № 22 (вул. Я. Чачота, 23) на прэзентацыю кнігі Міхася Пазнякова «Выход всегда есть…» Пачатак у 16.00.

25 верасня — у Магілёўскую гарадскую бібліятэку імя Пушкіна (Пушкінскі праспект, 36) на творчую сустрэчу з Дзмітрыем Нікалаевым. Пачатак у 11.00.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк
19.09.2024 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 693

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецт-ва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 3820000000767 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 2073

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 24036